Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

20 ЖНІЎНЯ 2020 г. ЧАЦВЕР № 161 (29275)




НЯМА ЗАБАРОНЕНЫХ ТЭМ, ЁСЦЬ ДРЭННЫЯ ЖАРТЫ

ЧЫРВОНКА

ЛЮБІЦЬ ЖЫВЁЛ, ДЫК ЦЭЛЫМ ЗААПАРКАМ!

ЧЫРВОНКА



## ЦЫТАТА ДНЯ



**Генадзь БАЛБАТОЎСКІ, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва:**

*«Попыт на аздараўленне ў беларускіх санаторыях стабільны. У нас на 19 жніўня знаходзіцца больш за 20,2 тысячы чалавек, запаўняльнасць санаторыяў — амаль 80 %. Гэта аптымальны паказчык з улікам дзеючых рэкамендацый па захаванні супрацьэпідэмічных мер і сацыяльнага дыстанцыявання. Адзначаем таксама ўстойлівы попыт на пуцёўкі ў свабодныя рэалізацыі: па іх сёння аздараўляецца каля 10 тысяч чалавек. З іх замежных грамадзян — 1907. Штодня іх заязджае каля 100 чалавек. Сярод замежных грамадзян больш за 90 % — расіяне».*

## КОРАТКА

- **Саўмін пашырыў спіс кампаній, якім будуць паскорана вяртаць ПДВ.**
- У Гомельскай вобласці доля дзяржмаёмасці, якая не выкарыстоўваецца, складае 2,4 %.
- **Памерла народная артыстка Беларусі Ірына Савельева.**



- Урад вызначыў медустановы для бясплатнага ЭКА.
- **ААН запрашае дзяцей і падлеткаў паўдзельнічаць у конкурсе плакатаў да Сусветнага дня харчавання.**
- Сезон палявання на лася, аленя і лань адкрываецца 20 жніўня.

ISSN 1990 - 763X



# Спас у азёрным Браславе



У Свята-Успенскай царкве Браслава — помніку дойлідства 1897 года пабудовы — прайшло святочнае набажэнства ў гонар Праабражэння, якое ў народзе называюць Спасам, альбо Яблычным Спасам. Правёў літургію і здзейсніў абрад асвячэння садавіны настаяцель прыхода протаіерэй Міхаіл Каляда.

**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

Спажывецкі кошык

## Ідзём на Камароўку

### Пры любых узрушэннях людзям трэба есці

**Візітная картка Мінска — Камароўскі рынак — сустракае нязвыклай адсутнасцю пакупнікоў, ды і прадаўцоў не надта шмат: то тут, то там — пустыя прылаўкі. Зрэшты, асартымент па-ранейшаму шырокі і разнастайны, а прадаўцы добразычлівыя, гатовыя пагутарыць з пакупнікамі на любыя тэмы і дараваць вам 20 капеек, калі на пакупку іх не хапае. Бо на Камароўку людзі ходзяць у тым ліку па душэўнасць.**

СТАР. 4



Будзьце пільныя!

## «Прадам IPHONE11 у выдатным стане»

### Пад выглядам прадаўцоў тэлефонаў, мэблі і іншых тавараў вас могуць падмануць махляры

**Гэтым летам у інтэрнэце зноў актывізаваліся махляры, якія крадуць грошы з картак беларусаў. І робяць гэта праз папулярныя сайты па продажы і куплі тавараў накшталт «Куфара». Ледзь не стала адной з такіх ахвяр і я — што рабіць, такая вось дурніца.**

У аферу мяне ўцягнула дачка — знайшла на «Куфары» прыватную аб'яву аб продажы iPhone11 (не новага, але мара-мара), напісала прадаўцу і пакінула мой нумар тэлефона. Праз нейкі час аб'ява знікла, а мне на «Вайбер» прыйшло паведамленне: «Добры дзень, Алена, вы мне пісалі наконт iPhone11. У колькі зможаце пад'ехаць да мяне?» Не да канца верачы ў сваё шчасце (бо такія айфоны па прымальнай цане — усяго 1500 рублёў — забіраюць вельмі хутка), адказваю, што ў любы час. Дзяўчына-прадавец паведамляе, што яна знаходзіцца ў Маладзечне. Паколькі я ў адпачынку і на машыне, то гатова паехаць і ў Маладзечна. Гадзіна ў дарозе — хіба перашкода на шляху да мары?

Прадавец удакладняе, ці з Мінска я паеду, і прапануе зрабіць па-іншаму: «У мяне тэлефон цяпер з сабой, бо раніцай павінна была сустрэцца з чалавекам, а ён не прыйшоў. Працую на складзе транспартнай кампаніі. Магла б сама кур'ера са зніжкай аплаціць да вас. Вам бы яго ў Мінск прывезлі, плюс вы б праверыць яго маглі пры кур'еру. Як вам такі варыянт? Праз дзве-дзве з паловай гадзіны яго вам ужо прывязуць. Заадно і грошы на бензіне сэканоміце». Ніякія падазрэнні на той момант у мяне яшчэ не зарадзіліся, пагаджаюся і на такі варыянт.

СТАР. 13

З першых вуснаў

# «Усякія перамены павінны быць прапісаны ў Канстытуцыі. І гэтая работа працягваецца. Яна будзе актывізавана»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў пасяджэнне Савета бяспекі з удзелам кіраўнікоў рэгіёнаў па відэасувязі.**

Першае пытанне — ураджай. Засталося сабраць 10 працэнтаў збожжавых. «Але наперадзе яшчэ вельмі шмат работы для таго, каб сабраць багаты ўраджай і быць упэўненымі ў будучыні — што сітуацыя не толькі з харчаваннем, але і ў эканоміцы ў нас будзе стабільная», — перадае словы Аляксандра Лукашэнкі яго прэс-служба.

Другая тэма нарады — грамадска-палітычная сітуацыя. Тут кіраўнік краіны вызначыў пагрозы на адрас сем'яў вайскоўцаў, міліцыі, спецслужбаў, дзяржаўных служачых, работнікаў СМІ. «Пагрозы і атакі (гэта таксама нас турбуе) на рабочых заводаў і фабрык, кіраўнікоў прадпрыемстваў. Іх перад і пасля рабочага дня прапускаюць на прахадной праз калідор агрэсіўнага натоўпу, — дадаў ён. — Я проста хачу сказаць рабочым, выказаць ім вялікую падзяку і папрасіць, каб яны не хавалі вочы ў асфальт. Вы, рабочыя, гаспадары на гэтым заводзе, а з гэтымі мітынгоўцамі, якія вас сустракаюць на прахадной, мы разбяромся».

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, заходнія краіны, не хаваючы, збіраюць сродкі для вулічных акцый. Ён параіў гэтым дзяржавам звярнуць увагу на свае ўнутраныя праблемы. «Кіраўнікі заходніх дзяржаў прапануюць нам перагаворы, размовы. А гэтым часам працягваюць гнуць сваю лінію. Мы таксама гэта бачым, разумеем, але не ўспрымаем. Я хачу, каб яны гэта пачулі. Яны збіраюцца правесці сёння ці заўтра нараду на ўзроўні ці то МЗС, ці то кіраўнікоў Еўрапейскага саюза, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Я проста б ім параіў: перш чым тыкаць пальцам у нас, унесці ў парадак дня сваіх нарад пытанні «жоўтых камізэлек» у Францыі, жудасных беспарадкаў у ЗША».

Альтэрнатыўныя органы, створаныя ў Беларусі, Аляксандр Лукашэнка назваў «чорнай сотняй для прыёму і перадачы ўлады». «Што дзіўна, там ужо сталі ў чэргі і дзеляць партфелі. Я хачу сказаць: паважаныя чарнасоценцы, у краіне няма такой колькасці партфеляў, колькі вас стаіць у чарзе. Венікі і рыдлёўкі ў нас ёсць. Мы забяспечым, — перадае прэс-служба словы кіраўніка краіны. — Хачу паўторна нагадаць: стварэнне альтэрнатыўных, паралельных і іншых органаў, тых жа «сотняў», з мэтай захопу ўлады караецца законам».

Таксама на нарадзе Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што дзеючая ўлада — не адзінокая. Ён меў на ўвазе мітынгі ў беларускіх гарадах у яго падтрымку. «І хачу сказаць, што ўладзе ёсць на каго абаперціся. Таму мы не задрыжым. Мы свой шлях пройдзем так, як гэта трэба», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Сярод тэм пасяджэння прагучаў каментарый наконт рэформаў і змен. Асноўнае патрабаванне да іх — быць у рамках закона. «Перамены ўсякія павінны быць прапісаны ў Канстытуцыі. І гэтая работа працягваецца. Яна будзе актывізавана. І наколькі гэта магчыма, і наколькі гэта будзе падтрымана насельніцтвам, ад гэтага залежыць хуткасць прыняцця Канстытуцыі. І па Канстытуцыі мы ўжо можам весці дыскусіі аб пераабранні органаў улады», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Яшчэ адна праблема — гэта фэйкі. Адкрытая хлусня ў інтэрнэце: замежныя войскі ў Беларусі, тэхніка з Расійскай Федэрацыі ў Беларусі. Вы, напэўна, ужо гэта бачылі, калі гэтыя фэйкі раскручваюцца. Бяруць калону ваеннай тэхнікі — невядома калі, невядома чыя, невядома на якой дарозе, але трэба сказаць, што яны з расійскай граніцы ў Оршу рухаюцца, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Знялі, не разумеючы таго, што гэта беларускія БТР, а не расійскія. І што яны рухаліся ў напрамку заходняй граніцы, калі мы прынялі рашэнне аб тым, што нам трэба прымаць дадатковыя меры па абароне дзяржаўнага суверэнітэту і незалежнасці, дзяржаўнай граніцы на Захадзе».

Па яго словах, сёння ў краіне няма ніводнага замежнага вайскоўца.

## Выніковыя рашэнні пасяджэння Савета бяспекі агучыў Аляксандр Лукашэнка

### Дзяржпагранкамітэту:

Узмацніць ахову дзяржаўнай граніцы па ўсім перыметры ў мэтах недапушчэння ў Беларусь з іншых краін баевікоў, зброі, боепрыпасаў, грошай для фінансавання беспарадкаў.

«Плацяць людзям, якія хочуць зарабіць. З кветачкамі пастаяць, яшчэ нешта зрабіць. Я не хачу сказаць, што ўсе такія. Але вялікія грошы паступаюць, і прытым у адкрытую», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

### Міністэрству абароны:

Асаблівую ўвагу звярнуць на перамяшчэнне войскаў НАТА на тэрыторыю Польшчы і Літвы, адсочваць напрамкі іх руху і задумы.

«Гэта значыць, трэба кантраляваць гэтыя пытанні. Асабліва ў Гродне, у гродзенскім напрамку. Бо ўжо вельмі вялікае жаданне там дэстабілізаваць абстаноўку яшчэ больш, чым у Мінску», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

### Міністэрству ўнутраных спраў:

Не дапускаць беспарадкаў у краіне, асабліва ў Мінску, абараніць працоўныя калектывы ад шальмавання і пагроз вуліцы.

«У Мінску не павінна быць больш ніякіх беспарадкаў. Людзі стаміліся, людзі патрабуюць міру і цішыні, — падкрэсліў кіраўнік краіны. — Бо мора людзей, пераважная большасць, якія прывыклі жыць у спакойнай краіне. І мы гэтую спакойную краіну павінны ім вярнуць».

### Камітэту дзяржбяспекі:

Выяўляць і спыняць дзеянні арганізатараў вулічных беспарадкаў, выкрываць каналы фінансавання беспарадкаў у Беларусі.

### Міністэрству замежных спраў:

Арганізаваць работу па давядзенні да кіраўнікоў заходніх дзяржаў інфармацыі пра сітуацыю ў Беларусі.

«Барабаніць гусеніцамі на граніцы з Беларуссю, праводзіць зараз вучэнні контрпрадукцыйна. Яны (кіраўнікі заходніх краін. — **«Зв.»**) павінны разумець, што будуць за гэта адказваць, калі нешта адбудзецца», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

### Сродкам масавай інфармацыі:

«Растлумачваць, расказваць, папярэджваць людзей, што праграмы гэтай «чорнай сотні» — шлях у прорву да знішчэння Беларусі як суверэннай і незалежнай дзяржавы. Вы гэта бачыце. Больш за тое, яны штурхаюць нас да сутыкнення з гістарычна брацкім нам народам — рускімі, расіянамі. Гэтага дапусціць нельга. Таму трэба актывізавацца сродкам масавай інфармацыі», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Калі хтосьці ў сродках масавай інфармацыі — АНТ, БТ, яшчэ дзесьці — хочуць пабаставаць, выйсці і потым зноў вярнуцца, такога шанцу ў іх быць не павінна. Сышлі — ідзіце. Але абараніць калектывы трэба. І гэта наша сёння задача», — дадаў ён.

### Ураду:

Забяспечыць рэалізацыю і кантроль даручэнняў па бесперабойным функцыянаванні прадпрыемстваў, аказаць падтрымку кіраўнікам прадпрыемстваў у арганізацыі вытворчага працэсу, засяродзіць увагу на вырашэнні паўсядзённых задач і пытанняў жыцця грамадзян краіны.

«Не трэба кідаць кіраўнікоў сам-насам з тым натоўпам, які часам сядзіць на прахадной, перашкаджае людзям працаваць. Ну і ўнутры ж прадпрыемстваў ёсць пэўнае кола людзей, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Мы не павінны нагнятаць у працоўных калектывах абстаноўку. Але тым не менш: хочаш працаваць — працуй (як я ўжо казаў), не хочаш — за вароты, не перашкаджай працаваць іншым».

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Байдэн зацверджаны кандыдатам у прэзідэнты ЗША ад дэмакратаў




Дэмакратычная партыя ЗША зацвердзіла 18 жніўня сваім кандыдатам у прэзідэнты на лістападаўскіх выбарах Джозефа Байдэна. Гэтае рашэнне прынята на агульнанацыянальным з'ездзе ў Мілуокі (штат Вісконсін), паведамляе ТАСС.

Галасаванне праз пандэмію праходзіла ў віртуальным фармаце. Прадстаўнікі дэлегацый амерыканскіх штатаў і заморскіх тэрыторый па чарзе аб'яўлялі пра тое, за каго іх дэлегаты аддаюць свае галасы — за Байдэна або сенатара ад штата Вермонт Берні Сандэрса. У выніку Байдэн атрымаў больш за 3550 галасоў, Берні Сандэрс — звыш 1150.

Прадстаўнік Дэмакратычнай партыі канстатаваў, што Джозеф Байдэн афіцыйна вылучаны ад яе кандыдатам у прэзідэнты і запрошаны выступіць з прамовай аб згодзе на гэта. Чакаецца, што гэта адбудзецца сёння.

Прэзідэнцкія выбары ў ЗША запланаваны на 3 лістапада. Кандыдатам ад рэспубліканцаў будзе дзейны прэзідэнт Дональд Трамп.

### Землятрус на Філіпінах: два чалавекі загінулі, 170 пацярпелі

У выніку землятрусу на Філіпінах два чалавекі загінулі, яшчэ каля 170 пацярпелі, паведамляе тэлеканал CNN Philippines.

Падземныя штуршкі нанеслі сур'ёзны ўрон будынкам у Катайнгане, на дарогах з'явіліся расколіны. Сейсмічная актыўнасць у рэгіёне працягваецца. «На цяперашні момант жыццё не нармалізавалася, таму што кожную гадзіну або кожныя 30 хвілін адбываюцца штуршкі. Людзі ўсё яшчэ нервуюцца і пакуль не хочуць вяртацца ў свае дамы», — паведаміў прадстаўнік мясцовай улады.

На ўчарашні дзень 18 пацярпелых у выніку землятрусу знаходзіліся ў бальніцах. Больш за 300 чалавек былі вымушаныя пакінуць свае дамы. Улады разглядаюць неабходнасць эвакуацыі каля шасці тысяч жыхароў.

### Навукоўцы ацанілі аб'ём акіянічнага мікрапластыку

У Атлантычным акіяне можа знаходзіцца да 200 мільёнаў тон маленькіх часціц пластыку. Да такой высновы прыйшлі брытанскія навукоўцы, якія ўдзельнічалі ў марской экспедыцыі і выявілі на сваім шляху 12 мільёнаў тон мікрапластыку, паведамляе Euronews.

Выніковая ацэнка, якая больш чым у 10 разоў пераўзышла папярэднія, была атрымана ў выніку экстрапаляцыі. Вынікі даследавання выкладзены ў англамоўным навуковым часопісе Nature Communications.

Пад мікрапластыкам навукоўцы разумеюць кавалачкі поліэтылену, поліпрапілену і полістыролу дыяметрам не больш за пяць міліметраў, якія, знаходзячыся ў вадзе, нябачныя для простага вока. Яны ўтвараюцца ў выніку распаду пластыкавых пакетаў, бутэлек і посуду, трапляюць у мора разам з іншым смеццем, але не раскладаюцца бактэрыямі, а толькі расшчапляюцца на дробныя часткі. Многія марскія жывёлы і птушкі прымаюць мікрапластык за ядомыя арганізмы і засмечваюць ім свае страўнікі, што нярэдка прыводзіць да гібелі.

Небяспечны мікрапластык пракраўся ўжо ва ўсе куткі Сусветнага акіяна. Нядаўна яго выявілі ў ільдах Арктыкі і Антарктыкі. Забруджвае ён і ўнутраныя вадаёмы, у тым ліку і возера Байкал, якое славіцца чысцінёй.

### Рональд Кума ўзначаліў «Барселону»

Вядомы нідэрландскі спецыяліст Рональд Кума стаў галоўным трэнерам футбалістаў іспанскай «Барселоны».

Па звестках афіцыйнага сайта «Барсы», кантракт з новым настаўнікам каманды падпісаны да 2022 года. Рональд Кума, якому цяпер 57 гадоў, гуляў у складзе каталонскага клуба з 1989 да 1995 года. За гэты час у «Барселоне» ён стаў чатырохразовым чэмпіёнам Іспаніі, тройчы заваёўваў Суперкубак краіны, па адным разе выйграваў Кубак краіны, Кубак еўрапейскіх чэмпіёнаў і Суперкубак УЕФА. Апошнім часам Рональд Кума ўзначальваў нацыянальную зборную Нідэрландаў.

У мінулым сезоне футбалісты «Барселоны» пад кіраўніцтвам іспанскага трэнера Энрыке Сет'ена не ўзялі ні аднаго нацыянальнага трафея, а ў нядаўнім чвэрцьфінале Лігі чэмпіёнаў прайгралі з буйным лікам 2:8 мюнхенскай «Баварыі».

## АДБЫЛАСЯ ТЭЛЕФОННАЯ РАЗМОВА ПРЭМ'ЕРАЎ БЕЛАРУСІ І РАСІІ

**Прэм'ер-міністры Раман Галоўчанка і Міхаіл Мішусцін учора ў тэлефоннай размове абмеркавалі нарошчванне эканамічнага супрацоўніцтва дзвюх краін. Інфармацыю пра гэта распаўсюдзіла прэс-служба ўрада Расійскай Федэрацыі.**

«Міхаіл Мішусцін і Раман Галоўчанка абмеркавалі канкрэтныя задачы, звязаныя з нарошчваннем расійска-беларускага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва і паглыбленнем кааперацыі ў энергетыцы, прамысловасці і іншых галінах», — гаворыцца ў паведамленні прэс-службы.

«Кіраўнікі ўрадаў пагадзіліся з важнасцю далейшага паглыблення практычнага ўзаемадзеяння ў рамках Саюзнай дзяржавы», — дадалі ў прэс-службе ўрада Расіі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне члену Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі КАРАСЮ Дзянісу Мікалаевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

# «ЗА БЕЛАРУСЬ»

**Пад сцягамі Рэспублікі Беларусь, прафсаюзных, ведамасных арганізацый і прадпрыемстваў у Магілёве на плошчы Леніна сабралася некалькі тысяч людзей з ліку працоўных калектываў, ветэранаў, жыхароў Магілёва і райцэнтраў — яны спецыяльна прыехалі паўдзельнічаць у мітынгу.**

На працягу гадзіны, пакуль доўжыўся мітынг, плошчу аблятаў верталёт з вялікім палотнішчам дзяржаўнага сцяга. Яшчэ адзін сцяг на ўсю вышыню будынка быў замацаваны на Доме Саветаў. Іграла музыка, людзі бадзёра махалі маленькімі чырвона-зялёнымі сцяжкамі і скандзіравалі следам за выступаючымі свае лозунгі.

З трыбуны да прысутных звярнуліся прадстаўнікі ўлады, міліцыі, кіраўнікі магілёўскіх прадпрыемстваў і грамадскіх арганізацый, дэпутаты, удзельнік вайны ў Афганістане. З заклікамі захаваць мір і стабільнасць у краіне выступілі старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід Заяц, генеральны дырэктар «Магілёўхімвалакна» Пётр Руднік, старшыня савета абласной ветэранскай арганізацыі Анатоль Глаз. Яны заклікалі не паддавацца на правакацыі і мірна працаваць, каб не нашкодзіць беларускай эканоміцы. Вельмі эмацыянальна выказалася пра сваё жыццё Ірына, у сям'і якой мірна ўжываюцца і беларусы, і рускія, і ўкраінцы. Яна сказала, што канфрантацыя ва Украіне вымусіла яе шукаць іншае месца жыхарства. У яе была магчымасць жыць за мяжой, але яна выбрала Беларусь, таму што тут было спакойна і бяспечна.

У гэты ж дзень адбыўся мітынг апанентаў, якія сабраліся на плошчы каля Магілёўскага гарвыканкама. Яны таксама прыйшлі на мерапрыемства са сваімі сцягамі і патрабаваннямі. І таксама казалі пра тое, што хочуць жыць у мірнай і свабоднай краіне.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# МЫ — АДЗІНЫЯ!

**Аб'яднаныя агульнай ідэяй, 15 тысяч жыхароў Гомельшчыны сабраліся на цэнтральнай плошчы абласнога цэнтра**

**Так у Гомелі адбыўся мітынг у падтрымку міру, бяспекі і спакою. Аб сваёй пазіцыі заявілі жыхары з усіх раённых цэнтраў: урачы, педагогі, журналісты, дэпутаты, рабочыя і звычайныя гараджане. Плынь людзей квітнела колерамі дзяржаўнай сімволікі.**

— Я прыйшоў сюды не агітаваць, не пераконваць. Я прыйшоў выказаць сваю грамадзянскую пазіцыю. Мы — адзіныя. Наша агульная мэта — багатая, шчаслівая, бяспечная, мірная Беларусь, — звярнуўся да ўсіх прысутных **старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ.** — Але ёсць тыя, хто сёння хаваецца за спінамі грамадзян, якія паддаліся эмоцыям, хто маніпулюе імі з дапамогай адмысловых паліттэхналогій. Яны маюць на ўвазе свае інтарэсы і з лёгкасцю гатовыя ўвесці наша грамадства ў бездань узрушэнняў. Мы сабраліся тут для таго, каб паказаць: мы грамадзяне нашай краіны, мы маем уласнае меркаванне.

Выказаць сваю пазіцыю са сцэны пажадалі таксама прадстаўнікі розных прафесій і сацыяльных груп: шматдзетныя маці, ваенныя, дзеячы культуры, дырэктары прадпрыемстваў, дэпутаты. Усе казалі аб жаданні захаваць і памножыць тое добрае, што ёсць у краіне, аб жаданні міру і стабільнасці ў Беларусі.

Слова папрасіла маці чацвярых дзяцей:

— Я больш не баюся, калі мае дзеці вяртаюцца дадому, ведаю, што ніхто іх не абражае. Я хачу жыць у мірнай Беларусі і не баяцца, што ў маё акно заляціць камень, — прамовіла шматдзетная маці Галіна Сінкевіч.

— Мы супраць таго, што зараз адбываецца на вуліцах. Супрацоўнікі ЖКГ з раніцы да ночы робяць усё, каб гараджане жылі ў чыстым і ўтульным горадзе. Гэта наша краіна, гэта наш горад, і мы з вамі маем права вырашаць іх лёс, — выказаў сваю пазіцыю генеральны дырэктар Гомельскага гарадскога ЖКГ Міхаіл Прус.

Ад імя Беларускага саюза жанчын Гомельскай вобласці да ўсіх жанчын і дзяўчат рэгіёна звярнулася дырэктар карціннай галерэі Г. Х. Вашчанкі Людміла Шымбалёва:

— Ні ў адной краіне свету няма такой падтрымкі для шматдзетных маці. Давайце годна падрыхтуем дзяцей да Дня ведаў, адправім студэнтаў на навучанне.

Генеральны дырэктар Гомельскага хімічнага завода Дзмітрый Чарнякоў сваёй прамовай падтрымаў вытворчыя прадпрыемствы Гомельшчыны:

— Візітная картка завода — нашы трубы. Калі людзі бачаць дым, разумеюць, што гэта пахне грашыма. Ад працы нашага завода залежыць дабрабыт многіх людзей. Сёння мы спыніліся на планавую праверку, а розныя тэлеграм-каналы напісалі, што мы канчаткова спынілі работу. Але я заяўляю: завод працаваў, працуе і будзе працаваць.

Пасля выступленняў спікераў гамяльчане запалілі ліхтарыкі, спявалі гімн Беларусі. Гэта быў вельмі кранальны момант, які заклікаў людзей аб'ядноўвацца.

Затым удзельнікі мітынгу накіраваліся на плошчу Працы, каб ускласці кветкі да Вечнага агню.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# Без дублюючых вытворчасцяў

**Чарговае пасяджэнне Савета па прамысловай палітыцы Еўразійскага эканамічнага саюза пройдзе ўвосень.**

Пра гэта паведамілі ў прэс-службе Еўразійскай эканамічнай камісіі па выніках сустрэчы **члена Калегіі (міністра) па прамысловасці і агарпрамысловым комплексе ЕЭК Артака КАМАЛЯНА** і **міністра прамысловасці і гандлю Расіі Дзяніса МАНТУРАВА.**

Бакі абмеркавалі рэалізацыю міждзяржаўных праграм і праектаў у ЕАЭС, стварэнне сучаснай лічбавай і інавацыйнай прамысловай інфраструктуры, праекты імпартазамяшчэння. Пацверджана важнасць прыняцця новага стратэгічнага дакумента ў прамысловасці на сярэднетэрміновы перыяд — Асноўных кірункаў прамысловага супрацоўніцтва да 2025 года.

«Дакументам мы закладваем чатыры асноўныя стратэгічныя прыярытэты ў ЕАЭС: максімальнае задзейнічанне патэнцыялу агульнага рынку прампрадукцыі, сумесную работу на экспартных рынках, паглыбленне прамысловай інтэграцыі, інавацыйнае супрацоўніцтва і лічбавізацыю прамысловасці», — сказаў Артак Камалян.

На сустрэчы абмяркоўваўся таксама ход рэалізацыі Карты індустрыялізацыі Еўразійскага эканамічнага саюза, якая стане інструментам каардынацыі дзеянняў дзяржаў-членаў па пытаннях імпартазамяшчэння. Мяркуецца, што Карта індустрыялізацыі будзе адлюстроўваць імпартазалежныя тэхналагічныя кірункі, імпартазамяшчальныя прамысловыя патэнцыял вытворцаў дзяржаў-членаў, прамысловыя праекты, якія ўжо склаліся, і кааперацыйныя сувязі ў ЕАЭС. Гэта дазволіць краінам пазбегнуць арганізацыі ў саюзе дублюючых вытворчасцяў і развіваць галіновую спецыялізацыю вытворцаў дзяржаў-членаў. Цяпер карта ўжо ўключае каля 180 буйных праектаў з аб'ёмам інвестыцый 200 мільярдаў долараў.

**Паводле БелТА.**

## Добрая навіна

# НОВЫЯ КАМБАЙНЫ — НА ЖНІВО

**Сёлета ў Прыдзвінні сто камбайнаў айчыннай вытворчасці папоўняць парк «крэйсераў палёў».**

Адпаведнае рашэнне было прынятае на ўрадавым узроўні. Паводле інфармацыі Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Віцебскага аблвыканкама, парк збожжаўборачных камбайнаў Віцебшчыны — каля 1370 адзінак. І каля 50 працэнтаў трэба замяніць, паколькі яны выпрацавалі свой рэсурс.

Першыя машыны, набытыя ў лізінг, накіравалі туды, дзе трэба было павысіць тэмпы жніва: у Віцебскі і суседнія Лёзненскі і Сенненскі раёны.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Культасвета

# Слова ў віртуальнасці

**Са жніўня ў сеціве па адрасе http://elib.minda.by пачала працаваць электронная бібліятэка Мінскай духоўнай акадэміі імя Кірылы Тураўскага.**

На сайце ў адкрытым доступе змешчаныя тэксты навуковых публікацый выкладчыкаў, аспірантаў і магістрантаў духоўнай семінарыі, матэрыялы навуковых канферэнцый, навуковыя дапаможнікі, матэрыялы па гісторыі царквы, даследаванні рэлігійных дзеячаў беларускай дыяспары за мяжой, а таксама перыядычныя выданні, якія выпускае Мінская духоўная семінарыя, — усяго звыш 1200 файлаў. Гэтыя матэрыялы датаваныя 2002—2020 гадамі. Капіяваць і цытаваць іх, падкрэсліваюць ствараьнікі рэсурсу, можна толькі ў некамерцыйных мэтах і з абавязковым указаннем аўтара твора і гіперспасылкі на электронную бібліятэку.

Як плануецца, гэты інфармацыйны рэсурс будзе ўключаны таксама ў міжнародны бібліятэчны рээстр OpenDOAR, у якім зарэгістраваны на сёння 34 электронныя бібліятэкі з Беларусі.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

## Блізкая ўлада

# ШТО ХВАЛЮЕ?

**Традыцыйна па суботах аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, паператворчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 22 жніўня, з 9.00 да 12.00 правядуць:

— першы намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Валерый Васілевіч РАБКАВЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;

— намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

— намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;

— першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Іван Алёйзавіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;

— намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан Барысавіч СТРАХАР. Тэл. 8 022 250 18 69;

— першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Сяргей Віктаравіч ЛЯЎКОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

— першы намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Дзмітрый Міхайлавіч МІКУЛЁНАК. Тэл. 8 017 222 44 44.

**У ТЭМУ**

18 жніўня ў Мінскім гарвыканкаме пачала дзейнічаць кругласутачная гарачая лінія, на якую жыхары сталіцы могуць звяртацца з усімі праблемнымі пытаннямі, звязанымі з жыццядзейнасцю горада. Як паведамляе тэлеграм-канал гарвыканкама, пакінуць скаргу ці заяву цяпер можна па тэлефоне 8 017 215 95 95.


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «БАТЭ» – управляющая компания холдинга «Автокомпоненты», г. Борисов, ул. Даумана, 95** |

**Предмет аукциона: недвижимое имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: Минская область, Борисовский район, г. Борисов, ул. Даумана, 91/1-3**

| Наименование (назначение), составные части и принадлежности | Инвентарный номер | Общая площадь |
|---|---|---|
| **Складское помещение РСЦ** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ). **Составные части и принадлежности:** складское помещение РСЦ (А1/к) | 610/С-61388 | 71,5 кв. м |
| **Венгерский склад** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ). **Составные части и принадлежности:** венгерский склад (А1-2/к), проезды (а1), подпорная стена (а2), ограждение (а3) | 610/С-61387 | 1712,6 кв. м |
| **Материальный склад** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ). **Составные части и принадлежности:** материальный склад (А1/к), пристройка (1) | 610/С-61390 | 521,5 кв. м |
| **Склад и растворный узел РСЦ** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ). **Составные части и принадлежности:** склад и растворный узел РСЦ (А1/к) | 610/С-61389 | 198,8 кв. м |

**Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,6550 га, предоставлен Продавцу на праве аренды сроком по 20.04.2045 для обслуживания материального склада, складского помещения РСЦ, венгерского склада, склада и растворного узла РСЦ

**Начальная цена (с НДС 20 %) – 575 609,26 белорусского рубля**

Порядок ознакомления с предметом аукциона: понедельник–пятница с 9.00 до 15.00 Иванов Дмитрий Олегович (главный инженер), тел.: +375 29 657-61-84; 8 (0177) 78-84-17

**Задаток 10 % от начальной цены лота** перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона |

**Условия аукциона**

Покупатель (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) обязан своими силами и за свой счет:
- в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня покупки предмета аукциона или иной, письменно согласованный с Продавцом, срок установить по границе земельного участка, разделяющее территории Продавца и Покупателя ограждение территории (высота 3 метра, непрозрачное, с установкой на ограждении колючей проволоки «Егоза»;
- возместить Продавцу расходы на рыночную оценку предмета аукциона в размере 600,00 (шестьсот белорусских рублей 00 копеек)

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Продавец или Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **22.09.2020 в 11.00, по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **21.09.2020 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

# Ідзём на Камароўку

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Тут ты купляеш не курыныя ножкі ў пластыкавай упакоўцы — проста ежу: прыгатаваў, з'еў і забыў. Тут ты прыдзірліва выбіраеш канкрэтную Курыцу Іванаўну, пра якую табе ахвотна раскажуць, адкуль яна прыехала ў Мінск і што з яе лепш гатаваць.

## ПАД ДАХАМ: МЯСА І КАЎБАСЫ

— Як з пакупнікамі?

— Глядзіце самі, — абарочваецца ў бок крытага гандлёвага павільёна прыгожая дзяўчына за прылаўкам з каўбасамі і салам.

— Можа, проста справа ў тым, што будні дзень, ды яшчэ раніца?

— Ды не, цяпер пакупнікоў наогул мала прыходзіць, нават у выхадныя. У людзей проста стала менш грошай. Мы дарагую каўбасу ўжо не заказваем, таму што не прадаць.

**Яблыкі на Камароўцы ў сярэднім у залежнасці ад сорту можна купіць па цане ад паўтара рубля да двух. Можна і танней, калі вы дзяўчына, а за прылаўкам — мужчына.**

Па словах суразмоўніцы, апошнім часам цэны на сыравяленыя і сыравэнджаныя каўбасныя вырабы, паляндвіцу, сала трохі падняліся — у сярэднім на два рублі на кожнае найменне.

— Гэта не наша віна. Мы бяром прадукцыю на прадпрыемствах, а яны паднялі цану.

У сярэднім на Камароўцы кошт мясных прысмакаў такі: паляндвіца — 29,90 рубля за кілаграм, сыравяленыя грудкі індычак — 31,99, карэйка — 15,99, рулет са свіных вушэй — 14,99, сала — не з камбіната, а з фермерскай гаспадаркі, «далікатнае, рэжацца як масла» — 12,99 рубля за кілаграм.

Перамяшчаюся ў аддзел сырога мяса. Тут кошты больш дэмакратычныя. Каля прылаўка збоку цэннік.

— Можна, я сфатаграфую цэны?

— Не трэба. Гэта няправільныя лічбы.

— Навошта яны тады?

— Няхай будуць, — усміхаецца прадавец. — А мы танней аддаём. Абы купілі.

Высветлілася, што цэны на мяса цяпер такія: грудзінка на засолку — 7,50—8 рублёў, карэйка — 8 рублёў, шыя — 11,90, лапатка — 5,99. Гэта свініна. Ялавічына, па традыцыі, даражэйшая. Напрыклад, фарш «Элітны» — аж па 12,90 за кілаграм. Затое, растлумачылі мне, дадаваць у гэты фарш свініну не трэба — катлеты з яго атрымліваюцца дыетычныя і не цвёрдыя, проста растаюць у роце.

— Так, пакупнікоў мала. Канец лета, ды яшчэ і канец месяца, — вось у людзей грошай і няма: дзяцей у школу сабралі плюс квартплату заплацілі. У апошнія тыдні жніўня кожны год пакупнікоў мала, — кажа прадавец.

На ганаровым месцы на прылаўку ляжыць мяса на шашлык.

— На шашлыкі часта мяса купляюць?

— Зразумела. Лета яшчэ не скончылася, ды яшчэ будзе бабіна лета. Я скажу вам так: мяса будуць купляць заўсёды, пры любых сацыяльных узрушэннях людзям трэба есці. Нават на мітынг галодным ніхто не пойдзе. А я наогул ні за кога. Я за мір і спакой.

Суразмоўніца наракае, што сёння людзі развучыліся працаваць.

— Бачыце, колькі пустых прылаўкаў! Людзі, асабліва моладзь, не хочуць ісці сюды. Тут цяжкая праца. Але можна і зарабіць. А цяпер усе хочуць атрымліваць грошы «на дурніцу». Прасцей знайсці чалавека на вакансію дырэктара, чым на вакансію прадаўца.

Няма пакупнікоў і каля прылаўка з яйкамі. Дзяўчына за ім ахвотна падтрымлівае гутарку і апавядае мне пра перавагі яе тавару перад крамнымі яйкамі. Цана на іх на рынку ў залежнасці ад катэгорыі — 1,80—2,10.

Самі куры з птушкафабрык у сярэднім па рынку каштуюць столькі: кураняты — 3,30 за кілаграм, сцёгны — 4—4,99, грудкі — 4,50—5 рублёў, філе — 6,59 рубля. На адной з вітрын знайшліся такія, здавалася б, забытыя прадукты, як курыныя галовы (з дзюбамі, вачыма і грабеньчыкамі) і лапы (з кіпцюрамі).

— Чаму забытыя? — здзіўляецца прадаўшчыца. — У нас яны заўсёды ў асартыменце. Іх кітайцы вельмі добра купляюць. Ну і нашы людзі — суставы лячыць.

— У сэнсе?

— Ну, у курыных лапах і галовах утрымоўваюцца рэчывы, якія суставам дапамагаюць. Ад артрытаў, артрозаў.

Індычка традыцыйна даражэйшая за кураціну. Грудкі індыкоў — у сярэднім 4,70 за кілаграм, філе — 18 рублёў, столькі ж каштуе індычына на шашлык.

За прылаўкам з перапёлкамі, іншай хатняй птушкай і трусамі не перажываюць з нагоды таго, што на рынку немнагалюдна. Пакупнікоў тут заўсёды не надта шмат, і, як правіла, яны пастаянныя. Птушка і трусы на продаж скупляюцца на прыватных падворках.

— Хто аднойчы пакаштаваў сапраўдную курыцу замест бройлера, той будзе нашым пастаянным пакупніком, — кажа жанчына за прылаўкам. — Яшчэ досыць часта бяруць трусоў. А вось гусі больш ідуць да святочнага стала.

Цана на курыцу з прыватнага падворка — 12 рублёў за кілаграм. Перапёлак прадаюць аж па 35 за кілаграм. Але і на іх, як сцвярджаюць прадаўцы, знаходзіцца свой пакупнік.

**Пакупнікоў няшмат, таму на крытым рынку многа акцый па зніжках на розныя віды прадукцыі.**





## НА СВЕЖЫМ ПАВЕТРЫ: АГАРОДНІНА, САДАВІНА, ГРЫБЫ

Перамяшчаемся на адкрыты рынак. Сёння дождж, так што наведвальнікаў мала і тут. Але ўсе прылаўкі занятыя.

Цэны на ўкраінскія памідоры вар'іруюцца: 1,99 на буйныя чырвоныя, 3,50 за кілаграм жоўтых, чорныя — за 2,99. Буйныя беларускія памідоры прадаюць па 3 рублі за кілаграм. Зялёныя на засолку аддадуць за 1,15, перац — ад 4 да 4 ,50. І агуркі, і баклажаны, і цыбуля, і морква каштуюць каля 2 рублёў за кілаграм. Зрэшты, у прыватніка на сезонным рынку знайшла агуркі па 5 рублёў.

— Што за агуркі такія? — абураецца дзядуля, які праходзіць міма.

— Гэта сорт «Раднічок», яны на засолку ідэальныя — у слоіку не разлезуцца. А па 2 рублі будуць мяккія, не будуць хрумсцець, — адказвае жанчына сярэдніх гадоў, прадавец. — І ў свежым выглядзе вельмі смачныя.

Яблыкі на Камароўцы ў сярэднім у залежнасці ад сорту можна купіць па цане ад паўтара рублі да двух. Можна і танней, калі вы дзяўчына, а за прылаўкам — мужчына:

— Прадаваў за паўтара, але вам аддам за рубель.

Казахскія кавуны — 2 рублі за кілаграм (можна папрасіць знайсці менш, але ў асноўным усе як на падбор, на 4–5 кілаграмаў), дыня «Тарпеда» — 3 рублі за кілаграм. Вінаград — 3,50.

На сезонным рынку (зялёныя навесы злева ад асноўных гандлёвых радоў) цяпер актыўна прадаюць ягаду.

— Гэта не чарніцы, гэта садовыя буякі, — папраўляе мяне прадаўшчыца. — Ці, як кажуць у нас у вёсцы, дурніцы. 25 рублёў вядзерца.

Пытаюся, адкуль прыехалі ў Мінск буякі. Аказалася, з Баранавіцкага раёна. Адтуль жа і брусніцы — 5 рублёў за літр. Пластыкавы кубачак малін і ажын каштуе аднолькава — 3 рублі.



Зялёная цыбуля каштуе 80 капеек за 100 грамаў.



Лясныя грыбы карыстаюцца сярод асартыменту адкрытага рынку, напэўна, найбольшым попытам.







Позняя клубніцы — буйныя і прыгожыя. Як на смак — не ведаю. Прадавец кажа — салодкія.

Садаводы-агароднікі сёння актыўна асвойваюць і незвычайныя культуры. Так што на Камароўцы мне ўдалося знайсці нават такі цуд, як тыбецкія маліны. Экзотыка будзе даражэйшая за звыклыя маліны — 5 рублёў за літр. Вырашчана яна пад Слуцкам.

На сезонным рынку прадаўцы таксама кажуць пра тое, што пакупнікоў апошнім часам мала. А найбольшым попытам карыстаюцца лясныя грыбы.

— Тры вядзерцы чырвонагаловікаў з раніцы ўжо прадала, — кажа ўсмешлівая дзяўчына за прылаўкам. — Апошняе засталося. Па 15 рублёў аддаю, а так прадавала па 20. Але думаю: чаго яму тут, беднаму, аднаму стаяць, хай ужо хутчэй купяць.

Увогуле Камароўка па-ранейшаму — месца душэўных пакупак. Праўда, многія мінчане аддаюць перавагу рынку «Лябяжы» — кажуць, там танней, асабліва, калі купляць сезонную агародніну і садавіну ў аптавікоў. Але тут варта ўлічыць, што да кошту прадуктаў давядзецца дадаць выдаткі на дарогу — «Лябяжы» знаходзіцца за горадам, а да Камароўкі, як ні круці, дабірацца зручней. Справа густу, як гаворыцца. Дарэчы, у маі славутай у Беларусі і за яе межамі «Камароўцы» споўнілася 40 гадоў.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

20 ЖНІЎНЯ 2020 г.
ЧАЦВЕР
№ 15 (15892)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

Імёны

# Фёдар БУЛКІН: «Няма забароненых тэм, ёсць дрэнныя жарты»




**З кожным годам мастацтва стэндап-камедыі становіцца ўсё больш папулярным. Гледачам падабаецца, што гумарысты, якія выступаюць сам-насам з залай, раскрываюць сваю сапраўдную асобу, дзеляцца з аўдыторыяй перажываннямі, эмоцыямі. Але ці адразу соцыум быў гатовы да гэткіх жартаў, якія вельмі адрозніваюцца ад больш звыклага для многіх гумару Клуба вясёлых і знаходлівых? Аб гэтым «Чырвонка. Чырвоная змена» спытала Фёдара Булкіна — неаднаразовага ўдзельніка тэлешоу «Рассмяшы коміка», «Comedy батл» і іншых. Чалавека, які адзін з першых пачынаў займацца стэндапам у нашай краіне, і які зараз з'яўляецца паспяховым стэндап-комікам і вядучым мерапрыемстваў. Дарэчы, чытачы маладзёжнага дадатку ўжо знаёмыя з Фёдарам: аб тым, як пачыналася яго кар'ера і ў якіх конкурсах удзельнічаў малады чалавек, можна прачытаць у «Чырвонцы. Чырвонай змене» ад 18 кастрычніка 2018 года.**

Фёдар скончыў факультэт маркетынгу, менеджменту і прадпрымальніцтва БНТУ ў 2012 годзе, але не працуе па спецыяльнасці з 2015 года. Малады чалавек у пэўны момант зразумеў, што не паспявае сумяшчаць работу і кар'еру коміка. Нягледзячы на тое, што ў самым пачатку суразмоўніку і яго камандзе прыходзілася выступаць за «паснедаць», любімая справа аказалася ў прыярытэце. Прайшло пяць гадоў, і цяпер, зразумела, коміку аплачваюць і райдар, і ганарар. Фёдар сваю сённяшнюю стэндап-кар'еру характарызуе такім чынам:

— Свой узровень заробку ў стэндапе я называю «падтрыманнем формы»: з выступленняў хапае на камуналку, на «паесці» і на запраўкі машыны. Усё астатняе — купіць тэлефон, адзенне, схадзіць на спатканне з дзяўчынай — за грошы ад правядзення вяселляў, карпаратываў і іншых мерапрыемстваў. Я называю апошняе бонусам ад стэндапу: людзі бачаць маё выступленне і завуць праводзіць іх свята, бо хочуць, каб яно прайшло смешна і весела.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Важацкі хлеб

## «МАЯ ПРАЦА — МАЁ ХОБІ», або Як вярнуцца ў дзівосны свет дзяцінства

**Некалькі гадоў таму, падчас вучобы ў Лінгвагуманітарным каледжы Мінска, я пазнаёмілася з Юліяй ДРОБЫШ. Маладая прывабная дзяўчына выкладала ў нашай групе бізнес-англійскую мову. Кампетэнтная, добра ведала свой прадмет... І ў той жа час тактоўная, спагадлівая, удумлівая... Але мы палюбілі яе не толькі за гэта. На занятках навучэнцы ніколі не баяліся задаваць пытанні або выказваць свае думкі. Але ж дысцыпліны і якасці ведаў ад гэтага ніколі не бракавала і заўсёды яны былі на высокім узроўні.**

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*



Важатая *(у цэнтры)* з атрадам.

Ёсць кантакт!

## ЛЮБІЦЬ ЖЫВЁЛ, ДЫК ЦЭЛЫМ ЗААПАРКАМ!

**У сучасным свеце людзі і жывёлы непарыўна звязаны паміж сабой. Немагчыма нават уявіць, якім было б існаванне чалавека без гэтых мілых істот. Практычна ў кожнай сям'і жыве гадаванец, які патрабуе да сябе клопату і ўвагі. Аднак сям'я Буйняковых з вёскі Чапялі Салігорскага раёна пайшла далей і замест аднаго хатняга ўлюбёнца адкрыла цэлы кантактны заапарк. Мы пагаварылі з гаспадыняй сям'і Святланай і высветлілі гісторыю ўзнікнення і цяжкасці ўтрымання такога незвычайнага хобі.**



— У майго мужа з дзяцінства была мара — завесці каня, — расказала нам суразмоўніца. — Да таго ж, мы хацелі, каб нашы дзеці не былі залежныя ад гаджэтаў, таму вырашылі набыць сваю першую жывёлу — кабылу чорнай масці Фліку, якую купілі ў Літве. Наша гадаванка адразу ж была паслухмянай, вельмі ласкавай. Вось з яе ўсё і пачалося.

З часам колькасць жывёл у сям'і Буйняковых пачала павялічвацца і агульным саветам было прынята рашэнне адкрыць хатні кантактны заапарк. Галоўнае яго адрозненне ад традыцыйнага ў тым, што кожны госць пры жаданні можа дакрануцца да любога насельніка і нават пакарміць яго.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*

Альтэрнатыва

# ВУЧОБА БЕЗ НАСТАЎНІКА КАЛЯ ДОШКІ

## Як школьніку без страт інтэгравацца ў лічбавае асяроддзе?

**Пандэмія COVID 19 стала сур'ёзным выклікам для сістэм адукацыі ўсяго свету. Традыцыйнае навучанне face-to-face аказалася немагчымым. З такой глабальнай праблемай педагогі сутыкнулася ўпершыню.**

**Больш як 1 млрд 300 млн школьнікаў і студэнтаў былі закранутыя каранціннымі мерамі. Закрыццё школ і ВНУ прывяло да праблем псіхалагічнага характару. У дакладзе фонду Save The Children гаворыцца, што кожны чацвёрты школьнік або студэнт пацярпеў у сувязі з сацыяльнай ізаляцыяй ад дэпрэсіі ці стрэсу.**

**У Расіі, Украіне, Польшчы, Чэхіі, Германіі і іншых краінах, дзе быў абвешчаны каранцін, зрабілі стаўку на дыстанцыйныя формы навучання, каб не спыняўся адукацыйны працэс. Гэта быў новы досвед абсалютна для ўсіх, які цяпер спрабуюць асэнсаваць.**

**У Маскве, напрыклад, заўважылі, што наведвальнасць некаторых анлайн-урокаў матэматыкі ў школах перавышала 200 працэнтаў! Як гэта стала магчымым? Проста навучэнцы запрашалі сяброў з іншых школ на дыстанцыйныя ўрокі да сваіх любімых настаўнікаў. І педагогі, натуральна, не былі супраць. Адбывалася тое, што магчыма рэалізаваць толькі анлайн, бо не прывядзе ж адзінаццацікласнік свайго сябра да сябе ў школу на ўрок матэматыкі. Магчымасці і эфектыўнасць анлайн-адукацыі, досвед пераводу афлайн-заняткаў у анлайн (тэхнічныя аспекты, памылкі і рашэнні) аказаліся ў цэнтры ўвагі 3-й канферэнцыі па альтэрнатыўнай адукацыі.**



### ПЛЮСЫ І МІНУСЫ

— Мне было неверагодна складана перайсці ў анлайн, таму што я мела справу з першакласнікамі, — расказала **настаўніца пачатковых класаў лагойскай сярэдняй школы № 1 Святлана ІВАНЮШЫНА.** — А ў сакавіку, калі дзеці перасталі хадзіць у школу, мы па плане павінны былі вучыцца пісаць — гэта значыць, вучыцца трымаць ручку, вадзіць рукой па лісце, і абсалютна незразумелым было, як гэта рабіць. Пачала шукаць варыянты платформы і сэрвісы, якія можна выкарыстоўваць. У выніку маёй памочніцай стала платформа для навучання Core. Яна дазваляе ўстаўляць відэа, ілюстрацыі, інтэрактыўныя практыкаванні, дадаваць элементы тэсціравання, апытання, аўдыязапісы з уласным голасам для тлумачэння матэрыялу. Паколькі мае вучні яшчэ не вельмі добра чытаюць, я рабіла стаўку на галасавыя файлы. Асабліва складана мне давалася зваротная сувязь, каб дзеці зразумелі, над чым ім яшчэ трэба папрацаваць, а што атрымалася ў іх найлепшым чынам. Праўда, я амаль упэўнена, што калі сустрэнуся з усімі маімі вучнямі 1 верасня (і з тымі, хто быў у анлайне, і з тымі, хто наведваў школу), то ўбачу розніцу, таму што я не ўсіх іх трымала за руку, калі гэта было патрэбным. Але былі ў мяне і сапраўдныя адкрыцці. Бацькі скідвалі мне відэа, як іх дзеці самастойна, без дапамогі дарослых заходзяць на платформу, пераходзяць па спасылках, самі выконваюць заданні, затым фатаграфуюць свае работы і адпраўляюць іх мне. Мне здаецца, што гэта проста максімальная самастойнасць для шасці-сямігадовых вучняў. Прызнаюся, я была ўражана. Каму анлайн-навучанне падыходзіць, дык гэта самаарганізаваным дзецям. Але ёсць і дзеці, якім было складана навучацца анлайн, праўда, і ў класе ім таксама было няпроста вучыцца.

— У поўнай ступені анлайн-адукацыя не заменіць афлайн, — упэўнена кажа **псіхолаг і мантэсоры-педагог Алеся ТАЛПЕКАМАХАТАЕВА.** — Для маленькіх дзяцей вельмі важныя асабістыя стасункі. Да таго ж, прынцыпы мантэсоры-педагогікі накіраваныя на развіццё дробнай маторыкі і пачуццяў (зрок, слых, смак, нюх). Спазнанне свету адбываецца праз дотыкі і тактыльныя адчуванні. Таму калі вясной нам давялося пераходзіць у анлайн, правядзенню 30-хвіліннага ўрока ў мяне папярэднічала пяцігадзінная падрыхтоўка. І, мушу заўважыць, што поспех дзіцяці ў немалой ступені залежыць ад уцягнутасці ў працэс навучання бацькоў.

— Калі нашы заняткі перайшлі ў анлайн, для мяне асноўнай праблемай было зрабіць так, каб яны не ператварыліся ў паэтапнае маляванне. Бо такіх відэа шмат у інтэрнэце і тады незразумела, а навошта мы? — канстатуе **кіраўнік студыі «Калякі-маляκі» Наталля НЯБОРСКАЯ.** — Якія я асабіста заўважыла плюсы ў такім навучанні? Адзін з іх — гэта пашырэнне геаграфіі выхаванцаў: у нас з'явіліся інтэрнацыянальныя групы, дзе былі дзеці з Ізраіля, Кіпра, Карэі, Канады. Але дзеці журацца, засмучаюцца, калі ў іх штосьці не атрымліваецца, а я не магу падысці і шапнуць ім штосьці на вушка (гэта інфармацыя не прызначана для ўсіх), у анлайне гэта зрабіць немагчыма. Ёсць і іншая праблема. Дзіця не можа гадзіну правесці, седзячы перад маніторам. Яму трэба ўстаць, пахадзіць, а калі навучанне адбываецца ў анлайне, гэта немагчыма зрабіць, каб штосьці не прапусціць.

Педагогі канстатуюць, што ў анлайне ім не хапала, у першую чаргу, жывога кантакту з вучнямі. Ім было складаней адсочваць уцягнутасць дзяцей, складаней выбудоўваць дыскусіі і абмеркаванне праблемных пытанняў. Усё ж такі адукацыйны працэс (асабліва ў пачатковай школе) мае на ўвазе псіхалагічны кантакт з педагогам, калі той матывуе, дапамагае дзіцяці пераадольваць пэўныя складанасці. Тым не менш яны прызнаюць, што ў змешанай мадэлі навучання (камбінацыі анлайн і афлайн-фарматаў) ёсць будучыня.

### ІНСТРУМЕНТЫ ДЛЯ ПЕДАГОГА

А ў першай у Беларусі анлайн-школе «Prime» абсалютна ўпэўненыя ў перспектыўнасці анлайн-навучання. «Гэта першая школа, у якую не трэба хадзіць» — так яны сябе пазіцыянуюць. Заняткі праходзяць у тым месцы, дзе знаходзіцца дзіця — дома, на дачы або ў дарозе. Калі яно прапусціла ўрок, яго запіс дасылаецца на электронную скрыню.

**Анастасія ГАНЧАРОВА, кіраўнік адукацыйных праграм анлайн-школы «Prime»,** тлумачыць: тое, што адбывалася ў беларускіх школах у чацвёртай вучэбнай чвэрці, нельга назваць ні дыстанцыйным, ні анлайн-навучаннем. Той час многія бацькі небеспадстаўна прыгадваюць з жахам.

— А вы ўявіце сабе класны эфектыўны ўрок у любімага настаўніка ў афлайн-школе. Анлайн-урок — гэта фактычна той жа ўрок, толькі ў анлайн-асяроддзі з выкарыстаннем нейкіх дадатковых інструментаў, — заўважае Анастасія. — З улікам таго, што ў дзяцей няма фізічнай магчымасці кантактаваць паміж сабой на перапынку, яшчэ да пачатку заняткаў трэба даць ім магчымасць зрабіць гэта на навучальнай платформе. Уцягнутасць у анлайн-урок забяспечыць больш складана, таму лепш распачаць яго з ненавязлівай гутаркі або з вырашэння вынаходніцкіх задач. Гэта дапамагае дзецям разняволіцца і запускае разумовую дзейнасць.

У адрозненне ад дыстанцыйнага, анлайн-навучанне мае на ўвазе, што настаўнік заўсёды побач і адразу адказвае на тваё пытанне, калі табе патрабуецца дапамога пры выкананні нейкага задання, ты можаш яе атрымаць адразу, а не праз суткі па электроннай пошце. Змена дзейнасці павінна адбывацца кожныя 5—7 хвілін. Нельга ўсе 45 хвілін проста сядзець і глядзець у экран манітора.

Для таго каб урок не праходзіў сумна і манатонна, мы выкарыстоўваем розныя спосабы актывізацыі ўвагі дзяцей. Можна распачаць з прыцягнення асабістага досведу. Напрыклад, урок замежнай мовы на тэму «Вандроўкі» можна распачаць з аповеду вучняў пра тое, дзе яны любяць адпачываць, якія спосабы перамяшчэння выбіраюць для сваіх вандровак. Можам прапанаваць некалькі артыкулаў без загалоўкаў, каб вучні шляхам аналізу іх зместу паспрабавалі самастойна вызначыць тэму заняткаў. Такім чынам развіваем і функцыянальную адукаванасць, якая знаходзіцца ў цэнтры ўвагі міжнароднага даследавання PISA.

На першых хвілінах спрабуем зачапіць тэмай і паказаць вучням яе практычную значнасць. Вельмі любім метад «Кросэнс», калі прапануецца дзевяць выяў на адным слайдзе, а дзеці, шукаючы лагічныя сувязі паміж імі, павінны вызначыць тэму занятку. Выкарыстоўваем актыўна інтэлект-карты і ментальныя карты як добры спосаб для структуравання інфармацыі, прычым карты рыхтуюць не толькі педагогі, але і вучні ў якасці дамашняга задання. Актыўна выкарыстоўваем вэб-квесты, дзе гульнявая форма — толькі абалонка для навучання.

У інтэрактыўнай рабоце з тэрміналогіяй, слоўнікавымі словамі, замежнымі словамі ў ход ідзе сэрвіс **Quizlet.com.** Вельмі многіх цікавіць, як зрабіць прагляд відэаролікаў падчас заняткаў максімальна карысным і эфектыўным. Усім у дапамогу сэрвіс **EdPuzzle.com** з пытаннямі да кожнага прагледжанага эпізоду. Пакуль не адкажаш, не зможаш глядзець далей.

Арганізуем таксама мазгавыя штурмы. На этапе рэфлексіі выкарыстоўваем метад «3—2—1»: напісаць тры факты, якія запомніў на ўроку, сфармуляваць два пытанні па новым матэрыяле і скласці адно меркаванне па пройдзенай тэме. Спрабуем на анлайн-уроку развіваць і сумесную работу, выкарыстоўваючы гугл-дакументы або анлайн-дошкі. Сэрвіс Coreapp.org дапамагае нам забяспечыць зваротную сувязь і фарміруючае ацэньванне.

### МІФЫ ВАКОЛ ХАТНЯГА НАВУЧАННЯ

— Мне вельмі падабаецца такое паняцце, як пазашкольная сем'і, таму што ў ім адчуваецца свабода і індывідуальнасць, — кажа **псіхолаг і прафарыентолаг анлайн-школы «Prime» Алена РЖЭЎЦКАЯ.** — Яны лічаць, што навучанне ў дзяржаўных школах — кансерватыўнае і недастаткова гнуткае. У пазашкольных сем'ях дзеці актыўна займаюцца спортам, удзельнічаюць у спаборніцтвах, наведваюць творчыя студыі і школы. Такія сем'і шмат вандруюць, пераязджаюць з месца на месца. І яны шукаюць альтэрнатыўныя спосабы для навучання сваіх дзяцей.

Часта даводзіцца чуць пытанне: «Калі дзіця будзе цэлымі днямі сядзець дома і не хадзіць у школу, то як яно будзе сацыялізавацца?» Але перайсці на анлайн-адукацыю — не азначае закрыць дзіця дома і нікуды не выпускаць. Наадварот, у малога з'яўляецца больш вольнага часу для наведвання гурткоў, секцый, прагулак, стасункаў з сябрамі, хобі і іншых заняткаў. Забраць дзіця на анлайн-адукацыю не азначае прывязаць яго да ложка ці батарэі. Наша жыццё само па сабе — вялікая крыніца сацыялізацыі, дзе ёсць сябры, наведванне моўных школ, летнікаў, канцэртаў, тэатраў, музеяў, вандроўкі з бацькамі і гэтак далей. Прычым, сацыялізацыя — гэта стасункі не толькі з равеснікамі, як многія памылкова думаюць.

Яшчэ адзін міф — хатнія дзеці вырастаюць замкнутымі і сарамлівымі. Але і ў першым, і ў дзясятым класе, і ў 40 гадоў, калі чалавек — інтраверт, флегматык ці меланхолік, ён усё роўна лепш пасядзіць дома з кнігай або гаджэтам, чым пойдзе сацыялізавацца ў шумную кампанію. Ёсць таксама распаўсюджаны міф, што хоўмскулеры (дзеці, якія навучаюцца дома. — **Аўт.**) знаходзяцца ў цяплічных умовах, а школа рыхтуе іх да жыцця. Прабачце, а як быць з булінгам у школе, які пакідае моцныя псіхалагічныя траўмы на ўсё жыццё? А школьныя педагогі часта не лічаць патрэбным у такія працэсы ўмешвацца.

Я лічу вельмі важным навучыць дзіця жыць у гэтым свеце і не страціць у ім сябе, умець рабіць выбар, знаходзіць апору ў складаных сітуацыях, вучыцца казаць «Не» і навучыць дзіця таму, што яму не трэба знаходзіцца там, дзе яму некамфортна. Нашы дзеці растуць у лічбавым асяроддзі, і інтэграцыя ў гэта асяроддзе, на мой погляд, — самае натуральнае, што можа быць. Анлайн-адукацыя дазваляе свядома фарміраваць сваё акружэнне, а значыць, жыць у большай гармоніі з навакольнымі і з сабой.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Абітурыент–2020*

# Кузня кіраўніцкіх кадраў: попыт і прапанова

**У Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь адбылося ўрачыстае залічэнне першакурснікаў на бюджэтную і платную формы навучання. Сёлета ўчарашнія абітурыенты маглі прысутнічаць на мерапрыемстве як вочна, так і анлайн — для гэтага была арганізавана трансляцыя.**

Да залічаных звярнуўся рэктар Акадэміі Генадзь ПАЛЬЧЫК: «Прахадныя балы гэтага года сведчаць пра высокі ўзровень вашай падрыхтоўкі. Зараз перад адміністрацыяй і прафесарска-выкладчыцкім складам стаіць задача — апраўдаць вашы чаканні і надзеі не толькі ў арганізацыі адукацыйнага працэсу, але і студэнцкага жыцця ўвогуле. Хачу падкрэсліць, што ўсім, хто мае патрэбу, будуць забяспечаны месцамі ў інтэрнаце. Пры гэтым мы ўлічваем пажаданні тых, хто хоча жыць разам, каб стварыць для вас найбольш камфортныя ўмовы».

Вынікі прыёмнай кампаніі абвясціў адказны сакратар прыёмнай камісіі Аляксандр Гурын. На бюджэтную форму навучання прахадныя балы склалі: на спецыяльнасць «Дзяржаўнае кіраванне і права» — 350, «Дзяржаўнае кіраванне і эканоміка» — 336 (паўпрахадны — 333), «Кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі» — 344 (паўпрахадны — 341) . На платную форму навучання прахадныя балы склалі: «Дзяржаўнае кіраванне і права» — 328, «Дзяржаўнае кіраванне і эканоміка» — 269, «Кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі» — 281.

Сярод залічаных шмат тых, хто ўжо дасягнуў поспеху пры атрыманні базавай сярэдняй адукацыі. З іх 76 чалавек скончылі школу з залатымі і сярэбранымі медалямі, 10 маюць стабальныя сертыфікаты па прадметах ЦТ, яшчэ 15 падалі ў прыёмную камісію атэстаты з сярэднім балам «10», тры абітурыенты з'яўляюцца пераможцамі рэспубліканскіх алімпіяд. Таксама сярод абітурыентаў 79 выпускнікоў ліцэяў і гімназій.

Сёлета на першы курс для атрымання першай вышэйшай адукацыі залічана 180 чалавек. Больш за 70 працэнтаў абітурыентаў прадстаўляюць рэгіёны краіны.

У ВНУ адзначаюць, што попыт на спецыяльнасці Акадэміі кіравання ў апошнія гады расце. Унікальнасць падрыхтоўкі заключаецца ў тым, што ўсе тры спецыяльнасці, якія асвойваюць студэнты («Дзяржаўнае кіраванне і права», «Дзяржаўнае кіраванне і эканоміка» і «Кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі»), не маюць аналагаў у іншых установах вышэйшай адукацыі, і кожная з іх з'яўляецца комплекснай. Гэта значыць, што адначасова з набыццём запатрабаванай кваліфікацыі («юрыст», «эканаміст-менеджар», «менеджар-эканаміст інфармацыйных сістэм») выпускнікі атрымліваюць веды, уменні і навыкі ў галіне тэорыі і практыкі кіравання, вывучаюць некалькі замежных моў, праходзяць практыку на базе органаў дзяржаўнага кіравання, вядучых прадпрыемстваў і арганізацый, кампаній-рэзідэнтаў Парка высокіх тэхналогій.



У Акадэміі кіравання таксама рэалізуецца праграма другой вышэйшай адукацыі завочнай формы навучання па дзвюх спецыяльнасцях — «Дзяржаўнае кіраванне і права» і «Дзяржаўнае кіраванне і эканоміка». Вядзецца падрыхтоўка па чатырох спецыяльнасцях другой ступені вышэйшай адукацыі (магістратура) — «Дзяржаўнае кіраванне», «Дзяржаўнае кіраванне і права», «Дзяржаўнае кіраванне і эканоміка» і «Менеджмент», попыт на якія стабільна высокі.

Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь уваходзіць у лік самых прэстыжных навучальных устаноў у краіне і займае вядучае месца ў падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі кіруючых кадраў. Штогод навучанне тут праходзяць каля 9 тысяч чалавек. Установа адукацыі супрацоўнічае з 72 замежнымі профільнымі навучальнымі ўстановамі і арганізацыямі з 28 краін.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Прыярытэты*

# «Я НЕ РАБЛЮ РАКЕТЫ, АЛЕ ГЭТА ЎСЁ РОЎНА ВЕЛЬМІ КРУТА!»

## Расповеды пра сучасныя прафесіі і тое, што будзе актуальна ў будучыні

**Айцішнікі, гейм-распрацоўшчыкі, кантэнт-мейкеры, блогеры — мы нават не маглі ўявіць такія прафесіі яшчэ дзесяць гадоў таму ў самых смелых фантазіях, а зараз гэта штодзённасць. Усё мяняецца вельмі хутка, і часам некаторыя не паспяваюць усачыць за новымі тэхналогіямі. «Чырвонка. Чырвоная змена» паразмаўляла з моладдзю і даведалася пра сучасныя прафесіі, а таксама пра тое, што будзе, на іх погляд, актуальна ў будучыні.**

**Яўгенія РУСАК, графічны дызайнер SMM-агенцтва Jam:**



— У гэтай сферы працую ўжо два гады. Зацікавілася прафесіяй, калі пачала вывучаць ва ўніверсітэце камп'ютарную графіку і анімацыю.

Спачатку ўсюды шукала вакансіі і некалькі месяцаў выконвала розныя тэставыя заданні абсалютна бясплатна, а праз год мяне ўзялі на работу, дзе я атрымала свае першыя грошы. Што датычыцца бацькоў, то яны падтрымліваюць мяне ва ўсім, хоць і не працуюць у такой творчай сферы. А бабуля заўсёды казала, што я з дзяцінства добра малюю. Астатнім, хто не зусім разумее маю работу, прыводжу ў прыклад рэкламу і афішы. Я лічу, што дызайн вельмі важны, ён моцна ўплывае на людзей, хоць яны часцей за ўсё гэтага не заўважаюць. Мне здаецца, што ў будучыні будуць запатрабаваныя ўсе прафесіі, якія звязаны з IT-сферай: HR, дызайнеры і тэсціроўшчыкі.

**Данііл ШЭК, гейм-дызайнер Wargaming.net:**



— Мая прафесія — гейм-дызайнер, а для старэйшага пакалення тлумачу, што распрацоўваю відэа-гульні. Мы вырашаем праблему дызайну, каб зрабіць уражанні карыстальнікаў больш яскравымі. Я не раблю ракеты, але гэта ўсё роўна вельмі крута!

У самым пачатку плацілі вельмі мала, нягледзячы на рост маёй кваліфікацыі. Потым я трапіў у крутую кампанію, якая зрабіла тыя самыя «танчыкі». Зараз, будучы інтэрнам, атрымліваю больш за сярэднюю зарплату па Беларусі.

Мне вельмі прыемна, што ў маім асяроддзі шмат прагрэсіўных людзей старэйшага пакалення, якія падтрымліваюць мяне. Напрыклад, некаторыя з іх гуляюць у мае гульні.

На мой погляд, спецыялісты, якія вырашаюць вострыя пытанні з прадуктамі харчавання і агракомплексу, будуць вельмі запатрабаваныя ў будучыні. Мы ад гэтага нікуды не сыдзем, а пытанне аб тым, як усіх накарміць, актуальнае заўсёды. Яшчэ мне здаецца, што прафесіі, дзе трэба непасрэдна працаваць з самім чалавекам і яго ментальным здароўем, таксама будуць у прыярытэце. Гэтага не заменіць ніякі робат.

**Софія ЦЫКУНОВА, SMM-спецыяліст агенцтва 5S:**



— Зараз працую сторыс- і кантэнт-мейкерам, а таксама кам'юніці-менеджарам. Камунікую з падпісчыкамі, тым самым забяспечваю зваротную сувязь розным брэндам. Займаюся SMM ужо тры гады, але больш актыўна пачала працаваць толькі цяпер. Маё знаёмства з гэтай сферай атрымалася абсалютна выпадковым, калі я ўступіла ў студэнцкую арганізацыю ва ўніверсітэце. Думала, ну вось, проста зраблю пасты ва «УКантакце» або запошчу фотачку ў Instagram пра чарговае мерапрыемства на факультэце, а потым зразумела, якую вялікую важнасць мае сфера маркетынгу ў сацыяльных сетках.

Сапраўдную зарплату атрымала ўжо на стажыроўцы, калі месяц займалася акаўнтам крамы адзення. Там заплацілі вельмі мала, і мяне гэта крыху знервавала. У той час баялася зрабіць нешта не так, таму вельмі старалася. Нягледзячы на такую несправядлівасць, я ўсё роўна ўдзячная за першы дарослы вопыт.

Цяпер занадта шмат тых, хто пайшоў у SMM, таму што гэта дазваляе працаваць на фрылансе. І ад таго высокая канкурэнцыя, таму зарплата вельмі сціплая.

На мой погляд, прафесія будучыні — гэта стратэг-маркетолаг, які здолее не проста распісаць, што трэба рабіць кампаніі, а прыдумае эфектыўную і крэатыўную стратэгію для брэнда. І гэта абавязкова павінна адпавядаць трэндам і ўсяму, што адбываецца ў свеце. Таксама будзе актуальна прафесія дызайнера, які заўсёды патрэбны ўсюды. Што датычыцца айцішнікаў, то гэта бессмяротная прафесія.

**Анастасія РУДЗКАЯ, блогер, рэпарцёр БТ:**



— Акрамя работы на ТБ, я таксама мікраблогер і на гэты момант у мяне пяць тысяч падпісчыкаў у Instagram. Пачала весці блог у канцы дзясятага класа і проста выкладвала фотаздымкі. Першая рэклама прыйшла дзесьці год таму, калі маё стаўленне да вядзення акаўнта стала больш сур'ёзным. Напрыклад, зусім нядаўна кампанія ёгуртаў замовіла ў мяне рэкламу. А ў якасці кампліменту падарыла цэлы кошык садавіны і ўласнай прадукцыі. У мяне арганічны прырост падпісчыкаў, таму што я не заказваю рэкламу ў блогераў і не ўкладваю грошы ў таргет, як гэта робяць многія.

Спачатку я расказвала родным, што ёсць такая сацыяльная сетка, куды выкладваю свае фатаграфіі. І ўсе ставяцца да гэтага адэкватна. Мне пашанцавала са сваякамі, таму што яны ўсе ў «тэме». Нават бабуля сядзіць у TikTok! Вось нядаўна здымала ката з папулярным эфектам, дзе жывёлы размаўляюць, і мая бабуля актыўна ў гэтым дапамагала. Яна сказала, што абавязкова выкладзе відэа ў «Аднакласніках».

**Рэвека АХРАМЕНКА, студэнтка III курса факультэта журналістыкі БДУ.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
20 08 2020 г.

Прыемнае з карысным

# ПАДЗАРАДЗІ «БАТАРЭЙКУ»

## Правільны адпачынак — «вітамін» для душы і цела

**Кожнаму з нас дадзена аднолькавая колькасць гадзін у сутках. Аднак, нягледзячы на гэта, некаторыя не могуць знайсці лішняй хвіліны для вольнага часу, а хтосьці проста не ведае, чым сябе заняць.**

Многія хлопцы і дзяўчаты нават падчас канікул знаходзяць сабе падпрацоўкі ці займаюцца самаразвіццём, каб правесці вольны час з выгадай для сябе і выкарыстаць набытыя навыкі і досвед у будучыні. Найбольш просты спосаб зарабіць грошы на кішэнныя расходы — задзейнічаць магчымасці інтэрнэту ў сферы капірайтынгу, стварэння сайтаў, прасоўвання сацыяльных сетак і іншых цікавых кірункаў. Калі не хочацца сядзець за камп'ютарам, можна ўладкавацца афіцыянтам, кур'ерам, фатографам, памочнікам менеджара або, для студэнтаў, знайсці работу па сваёй будучай спецыяльнасці. Як паказвае практыка, мэтанакіраваныя хлопцы і дзяўчаты цалкам здольныя арганізаваць свой невялікі бізнес, пачынаючы з простых крокаў.

Многія маладыя людзі хочуць укладваць час у сябе. Менавіта таму яны запісваюцца на розныя курсы, наведваюць трэнінгі і семінары. Вывучэнне замежных моў, засваенне камп'ютарных праграм, плаванне, навучанне кіраванню аўтамабілем, занятак творчасцю і проста чытанне кніг дазваляюць студэнтам і школьнікам «прапампаваць» сябе і ўнесці інвестыцыі ва ўласнае развіццё. І няхай гэта можа быць напрамую не звязана з вучобай, але абавязкова спатрэбіцца для будучай кар'еры і жыцця.

У імкненні моладзі ўдасканальвацца іх падтрымліваюць і навучальныя ўстановы, якія не абмяжоўваюць хлопцаў і дзяўчат толькі вучобай, а даюць мноства магчымасцяў для арганізацыі карыснага вольнага часу нават у летні перыяд. Многія школы, сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы праводзяць падчас канікул арганізаваныя выезды на прыроду ці базы адпачынку, што дапамагае моладзі стаць больш згуртаванымі і падтрымліваць стасункі са сваімі аднакласнікамі або аднакурснікамі і па-за вучобай. Універсітэты і інстытуты таксама заахвочваюць захопленні сваіх студэнтаў і дапамагаюць ім працягваць развіваць свае здольнасці і летам. Студэнты займаюцца валанцёрскай і творчай дзейнасцю, удзельнічаюць у розных сацыяльных праграмах — напрыклад, арганізуюць дабрачынныя вечары або нейкія акцыі.

**Канікулы — ідэальны час для падзарадкі «ўнутраных батарэй», каб вярнуцца да вучобы і работы з новымі сіламі.**

Планаванне вольнага часу павінна быць гнуткім. Таму нават самыя занятыя хлопцы і дзяўчаты не пазбягаюць простых маладзёжных забаў: вечарын з сябрамі, паходаў у кінатэатр, рамантычных вечароў, квэстаў і спартыўных гульняў. Добрая фізічная падрыхтоўка сёння ў модзе, таму моладзь з задавальненнем прысвячае час спорту: многія займаюцца ў залах і на свежым паветры пэўнымі відамі, захапляюцца танцамі, асвойваюць новыя экстрэмальныя кірункі. Знаёмствы, энергічны музычны рытм і весялосць дапамагаюць пазбавіцца стомленасці і назапашаных негатыўных эмоцый.

Найлепшы ж варыянт адпачынку пасля інтэнсіўнай разумовай і фізічнай працы — знаходжанне на свежым паветры. Менавіта таму моладзь адпраўляецца ў турыстычныя паходы з песнямі каля вогнішча, ладзіць пікнікі з сябрамі ці барбекю ў коле сям'і: яны здольныя падарыць не толькі атмасферныя фотаздымкі, але ў дадатак і буру эмоцый, а таксама цёплыя ўспаміны на доўгія гады. Калі няма магчымасці арганізаваць працяглую паездку, добрай ідэяй будзе правесці хоць адзін дзень у ціхім маляўнічым месцы. Як варыянт, выбрацца куды-небудзь у батанічны сад, паркавую зону або да найбліжэйшага вадаёма. Часам варта проста прыглядзецца, і вы выявіце, колькі незвычайных і цудоўных мясцін знаходзіцца ў полі вашага зроку. Усяго толькі дзень, праведзены на свежым паветры, дапамагае дыстанцыявацца ад паўсядзённых праблем і аднавіць сілы.

Як бы банальна гэта ні гучала, але адным з найлепшых відаў адпачынку па-ранейшаму застаецца сон. Да яго далучаецца медытацыя, прагляд кіно, прыняцце гарачай ванны, рыбалка і ўсё тое, што дзейнічае на вашу душу як «вітаміны».

Канікулы — ідэальны час для падзарадкі «ўнутраных батарэй», каб вярнуцца да вучобы і работы з новымі сіламі. Аднак адпачынак — гэта не толькі патрэба кожнага жывога арганізма, але і магчымасць прыемна і прадукцыйна правесці вольны час. Жыццё моладзі насычанае падзеямі, таму важна ўмець правільна адпачываць, з карысцю для розуму і цела.

**Надзея БОБРЫК, студэнтка ІІ курса факультэта журналістыкі БДУ.**



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

# «МАЯ ПРАЦА — МАЁ ХОБІ»...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Я скончыла каледж... Юлія таксама змяніла месца работы і зараз настаўнічае ў адной з мінскіх школ. Але яе пары засталіся ў маёй памяці. Справа ў тым, што Юлія адна з тых асоб, пра якіх звычайна кажуць: «чалавек з вялізарнай унутранай энергіяй». Напэўна, з-за таго, што дзяўчына мае патрэбу бесперапынна аддаваць яе людзям, штогод, падчас свайго адпачынку ўлетку, яна з сур'ёзнага і строгага педагога ператвараецца ў вясёлую важатую, якая з лёгкасцю прыдумляе крычалкі, ставіць творчыя нумары ды танцуе разам з выхаванцамі.

Дзяўчына скончыла факультэт англійскай мовы МДЛУ ў 2016 годзе і атрымала спецыяльнасць выкладчыка рыторыкі і дзвюх замежных моў: англійскай і нямецкай. А ў ролі важатай упершыню паспрабавала сябе на практыцы пасля трэцяга курса, і з таго часу кожны год працуе ў гэтай якасці на ўсіх пяці летніх лагерных зменах.



Юлія *(злева)* з адной з выхаванак.

**«Дзеці — гэта тое, што мне патрэбна. Яны зараджаюць мяне пазітыўнымі эмоцыямі і вайбамі, як і я іх».**

Цікава, ці адрозніваюцца абавязкі выхавальнікаў пры рабоце з дзецьмі розных узростаў? Юлія расказвае, што працавала з малодшымі толькі аднойчы, калі ўпершыню прыехала ў лагер на практыку... Наступныя разы дзяўчыне даставаліся старэйшыя атрады. Параўнаўшы, суразмоўніца зрабіла выснову, што менавіта ёй падабаецца мець справу з больш дарослымі дзецьмі.

— Калі займаешся з маленькімі, вельмі шмат дадатковых абавязкаў, якія аўтаматычна знікаюць пры стасунках з падлеткамі. Першым даводзіцца дапамагаць у шматлікіх бытавых момантах, часам у іх зусім няма ўмення сачыць нават за сваёй асабістай гігіенай... За "малянят" нярэдка трэба рабіць усё: і выразаць, і маляваць, і ставіць танцы. Мне здаецца, што ў рабоце з імі адзіны плюс: рана кладуцца спаць! *(Смяецца.)* А ў больш дарослых хлопчыкаў з дзяўчаткамі свае светабачанне і інтарэсы, яны заўсёды маюць арыгінальныя думкі і нетыповыя ідэі. Прапаноўваюць, ставяць нумары, прыдумляюць плакаты, крычалкі, гербы і іншае.

Але і работа з падлеткамі мае свае нюансы. Магчыма, болей сур'ёзныя, чым нейкія бытавыя моманты з маленькімі дзецьмі. Юлія кажа, што даволі часта першыя робяць спробы правезці на тэрыторыю лагера цыгарэты або спіртныя напоі. Таму галоўная задача важатых: каб падлеткі заўсёды былі дагледжаныя і не рабілі небяспечных ды шкодных для здароўя спраў. Пастаянны кантроль вельмі важны, бо ён дапамагае пазбегнуць траўмаў. Калі выхаванец атрымлівае яе падчас спартыўных мерапрыемстваў, гэта лічыцца няшчасным выпадкам. А калі нешта здарылася ў вольны час, калі адказныя асобы не дагледзелі за дысцыплінай, тады ўсю адказнасць за траўму нясе важаты. Асабіста ў Юліі не было такога досведу, бо яны з калегамі стараюцца не пакідаць выхаванцаў без нагляду.

Таксама суразмоўніца расказвае, што дзеці са старэйшых атрадаў не заўсёды зацікаўлены ў лагерных мерапрыемствах. З некаторых яны проста вырастаюць, не жадаюць спяваць ці танцаваць, завісаючы ў сацыяльных сетках. Задача важатай — зацікавіць і аб'яднаць атрад, паказаць, што праводзіць час можна не толькі ў сеціве. У Юліі заўсёды атрымліваецца гэта зрабіць, і напрыканцы змены ўсе развітваюцца са слязамі на вачах.

Як важатыя дапамагаюць справіцца са стрэсам ад расставання?

— Мы запрашаем дзетак зноў вяртацца ў летнік. Хтосьці можа прыехаць на змены ў гэты ж год, а хтосьці сустрэнецца з пасталелымі сябрамі наступным летам. Проста кажам, што мы ўсе будзем на сувязі, будзем перапісвацца ў сацыяльных сетках, абменьвацца фотаздымкамі і гэтак далей, — дзеліцца сваімі педагагічнымі сакрэтамі Юлія.

Увогуле, летні лагер часта бывае тым месцам, дзе дзіцё ўпершыню пазнае сапраўднае сяброўства, саперніцтва, каханне... Важатыя ў такіх сітуацыях становяцца ледзве не адзінымі, да каго можна звярнуцца, з кім можна пагутарыць, спытаць парады.

— Выхавальнікі вельмі часта дапамагаюць дзецям у вырашэнні псіхалагічных і эмацыянальных праблем. Галоўнае — устанавіць кантакт, выклікаць давер выхаванцаў, каб яны былі гатовыя падзяліцца з вамі перажываннямі. Але заўсёды трэба трымацца залатой сярэдзіны ў стасунках. Нельга станавіцца найлепшай сяброўкай, бо ўсё ж такі павінна быць субардынацыя. Але важатаму абавязкова трэба застацца тым чалавекам, якому дзеці могуць давяраць. А яшчэ трэба заўсёды разумець, што некаторыя праблемы, якія нам, дарослым, падаюцца несур'ёзнымі, для падлеткаў могуць быць сапраўднай катастрофай.

**Увогуле, летні лагер часта бывае тым месцам, дзе дзіцё ўпершыню пазнае сапраўднае сяброўства, саперніцтва, каханне...**

Як прызнаецца Юлія, ёй пашанцавала, што яе работа — таксама і яе хобі. Яна нават не адносіцца да важацтва як да абавязку, бо заўсёды працуе ў кайф і адчувае задавальненне ад таго, што робіць. Дзяўчына кажа, што калі б было інакш, яна проста не займалася б гэтым.

— Я люблю кантактаваць з людзьмі, асабліва з дзецьмі. А сядзець за камп'ютарам і паперкамі мне зусім не падабаецца... Даўно зразумела: дзеці — гэта тое, што мне патрэбна. Яны зараджаюць мяне пазітыўнымі эмоцыямі і вайбамі, як і я іх. Кожны год вяртаюся ў гэты дзівосны свет дзяцінства, каб падзяліцца сваёй энергіяй і атрымаць новыя ўражанні...

**Паліна ПРАКАПЕНЯ, студэнтка ІІ курса факультэта журналістыкі БДУ.**
**Фота з асабістага архіва суразмоўніцы.**

*Асабісты вопыт*

# «У кожным новым хатнім гадаванцы бачу сябра»

**У апошнія гады набіраюць папулярнасць заaняні, якія даглядаюць жывёл, пакуль іх гаспадары вырашаюць свае справы. Спецыяльную адукацыю пры гэтым мець не трэба. У нашай краіне такіх ахвотных шмат: адны займаюцца пошукам кліентаў самастойна, іншыя — праз агенцтвы. Дваццацігадовая мінчанка Маргарыта ПОЛІВАДА належыць да першых: дзяўчына ўжо больш за два гады ў якасці хобі практыкуе догляд катоў, сабак, грызуноў і нават птушак.**



— Па прафесіі я цырульнік, у гэтым кірунку развіваюся і справу сваю люблю. З самага дзяцінства таксама была неабыякавая да сяброў нашых меншых, з імі ў мяне пэўная сувязь. Але бацькі заўсёды былі супраць таго, каб у доме былі жывёлы, хоць я вельмі марыла пра сабаку. Калі ўжо стала дарослая, аднойчы знайшла ў інтэрнэце інфармацыю пра тое, што хтосьці гатовы паняньчыцца з гадаванцам за пэўную суму. Тады ў мяне навіна выклікала абурэнне ад таго, што за такія паслугі бяруць грошы: для мяне магчымасць пасядзець з хатнімі гадаванцамі была сама па сабе радасцю. Я доўга думала і праз некаторы час ужо сама размясціла падобную аб'яву, але з сімвалічным коштам, — і да мяне пачалі звяртацца. Цяпер з задавальненнем бяру да сябе дадому на пэўны час розных жывёл. Мой абавязак як заaняні заключаецца ў тым, каб арганізаваць належны догляд хатніх гадаванцаў на час адсутнасці іх гаспадароў. Часцей за ўсё займаюся сабакамі любых памераў. Таксама дапамагаю валанцёрам з уладкаваннем тых жывёл, якія страцілі свой дом.

Маргарыта расказала, што некаторыя гадаванцы могуць заставацца на перапрымцы больш чым на год, бо не атрымліваецца адразу ўладкаваць іх у новую сям'ю. Напрыклад, адзін з такіх сабак, якому трэба было дапамагчы знайсці гаспадароў, трапіў у дом бацькоў суразмоўніцы, растапіў іх сэрцы і застаецца з імі дагэтуль.

— За два гады не было такой сітуацыі, каб у маёй кватэры не знаходзіліся нейкія жывёлы. Мне так камфортна — мець маленькіх сяброў побач, яны не даюць засумаваць і думаць пра непатрэбнае. Калі тыя трапляюць да мяне, асноўная задача — мінімізаваць стрэс ад разлукі гадаванцаў з гаспадарамі. Рэкамендацыі па доглядзе, кармленні і выгуле ва ўсіх рознымя, мы іх абмяркоўваем загадзя. Я заўсёды ведаю, што рабіць у незвычайных або нетыповых сітуацыях, у гэтым дапамагае захапленне кіналогіяй. Да таго ж мы заўсёды на сувязі з уладальнікамі. Зразумела, жывёлы не заўсёды паводзяць сябе ў кватэры добра, часам могуць сапсаваць рэчы. Да гэтых сітуацый стаўлюся спакойна, лічу, што ўся адказнасць за такія выпадкі на мне. Каб мінімізаваць недарэчнасці, не пакідаю гадаванцаў сам-насам, даю ім ласункі, цацкі, каб не сумавалі і не пераключалі сваю ўвагу на мэблю ці шпалеры.

> **«Мой абавязак як заaняні заключаецца ў тым, каб арганізаваць належны догляд хатніх гадаванцаў на час адсутнасці іх гаспадароў».**

Па назіраннях дзяўчыны, кожнаму гадаванцу неабходна некалькі дзён для адаптацыі ў новым месцы. А калі на «знаёмства» з жывёламі ў Маргарыты ёсць толькі некалькі гадзін, можа адбыцца рознае...

— Часцей за ўсё каты наогул адмаўляюцца ад ежы і нават вады. Хаваюцца ў пэўнае месца і часам доўга адтуль не вылазяць. Маленькія сабакі амаль заўсёды ўспрымаюць новага чалавека з агрэсіяй і спрабуюць укусіць ад стрэсу ці з-за новай абстаноўкі. Калі казаць пра сярэдніх па памеры і буйных сабак, то менавіта з імі мне працаваць прасцей за ўсё. Яны ў большасці выпадкаў сябе паводзяць выдатна як з гаспадарамі, так і з новымі людзьмі.

У Маргарыты зараз няма свайго асабістага маленькага сябра, але дзяўчына вельмі хоча амерыканскага стафардшырскага тэр'ера.

— Гэта парода з характарам «байца», якая патрабуе шмат увагі, ведаў і намаганняў па навучанні сабакі. Пакуль, на жаль, не валодаю такой колькасцю часу, няма магчымасці ўкладваць шмат сіл у яго выхаванне. Але ў будучыні абавязкова ажыццяўлю сваю мэту! Увогуле хочацца адзначыць, што не ўсе заaняні шчыра любяць жывёл: бываюць тыя, хто да іх ставіцца нейтральна або раўнадушна. Аднак я лічу, што доўга пратрымацца ў гэтай сферы з такім падыходам немагчыма, хутка страціш жаданне, бо насамрэч занятак досыць складаны. Тут ёсць як плюсы, так і мінусы. Добра, што з часам назапашваюцца карысныя веды, яны прыходзяць толькі з вопытам. Да таго ж хутка пачынаеш разумець асаблівасці паводзін розных парод кошак, сабак. Можна сказаць, што з кожным разам я набываю новага сябра, — ніколі не засумуеш. Да мінусаў можна аднесці любыя непрыемныя і нечаканыя сітуацыі — напрыклад, калі гадаванец праяўляе агрэсію.

Суразмоўніца пакуль не гатова да таго, каб догляд жывёл стаў яе асноўным відам дзейнасці. «Для мяне гэта хобі, жаданне ўзаемадзейнічаць з жывёламі, дапамагаць валанцёрам і самой уладкоўваць да сябе на пэўны час тых, каму патрабуецца цяпло і любоў чалавека».

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота дадзена гераіняй.**

# ЛЮБІЦЬ ЖЫВЁЛ, ДЫК ЦЭЛЫМ ЗААПАРКАМ!

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

— Наогул, калі купілі сабе першага каня, не думалі, што ў нас будзе свой заапарк. Набылі жывёлу проста для сябе, для душы. Мы жыхары гарадскія, таму адвезлі яе ў вёску да знаёмага. Каталіся на кані самі, а потым вырашылі, што трэба яшчэ купіць поні для нашых дзяцей, каб ім было не сумна. Чатырохкапытныя гадаванцы зацікавілі сяброў і знаёмых, яны таксама сталі прыязджаць, каб разам з дзецьмі пакатацца. Па «сарафанным радыё» пра нас даведаліся сябры сяброў і іншыя знаёмыя і сваякі, яны гэтак жа пачалі наведваць нас, некаторыя сталі пакідаць нейкую капейчыну. Мы самі будавалі для жывёл клеткі, кармілі, даглядалі і нам гэта падабалася. Нечакана наша хобі пачало цікавіць зусім незнаёмых людзей. Спачатку мы не бралі за ўваход ніякіх грошай, пакуль не купілі вярблюдзіцу. Гэта каштавала немаленькай сумы: адна такая жывёла абыходзіцца, як добры патрыманы аўтамабіль. А карміць і жывёл, ды і сям'ю неяк трэба. Тады мы зноў жа параіліся і пасля нараджэння трэцяга сына вырашылі развіваць гаспадарку і ўстанавіць фіксаваную цану за ўваход у заапарк. Над назвай доўга не думалі, назвалі ў гонар сыноў: «ДаРэМі» — абрэвіятура ад імёнаў Дабрыня, Рэнат і Мікіта.





Адкрыццё любога бізнесу — гэта заўсёды цяжка, асабліва калі не маеш патрэбнай адукацыі і вопыту. Але ўмелы падзел абавязкаў сярод членаў сям'і спрасціў нялёгкую задачу.

— У заапарку працуем толькі сваёй сям'ёй. Абавязкі размяркоўваем па меры здольнасцяў і ўзросту. Напрыклад, старэйшы сын найперш займаецца конямі, ён іх выводзіць на пашу, прыводзіць назад, поіць і корміць. Сярэдні даглядае больш дробных жывёл, напрыклад, козачак, авечак выгульвае пасля таго, як я іх падаю. Самы складаны абавязак у малодшага — ён падчас догляду за гадаванцамі глядзіць мульцікі альбо чухае ката за вухам *(смяецца)*. Ну, а муж назірае за намі *(смяецца)*. Яшчэ ўносіць сваю лепту разам са старэйшым сынам, калі штосьці трэба пабудаваць, падбіць, дзе патрэбна фізічная праца. Ці нешта падвезці на трактары, нарыхтаваць сена — гэта ўсё яго фронт работ.

> **«Пацалаваўся з казой, абняў труса, пачухаў за вухам тхара... Для нас гэта кайф, рэальны кайф!»**

Нягледзячы на такую з'яднанасць сям'і, з адной цяжкасцю яны ўсё ж такі сутыкнуліся.

— Галоўнай праблемай пры стварэнні кантактнага заапарка быў выпас. У нас шмат жывёл, якія гэтага патрабуюць, а зямель каля дома, ды і наогул паблізу, няма. Яны ўсе належаць сельсавету, таму карыстацца імі нельга, інакш будзе штраф. У выніку выбілі для сябе пару маленькіх лапікаў.

Колькасць жыхароў заапарка Буйняковых расце з кожным годам, як і геаграфія іх паходжання Напрыклад, вярблюдзіца Ізабэла з Сургута, згаданы вышэй конь — з Літвы, а вось асліца Мэры



апынулася ў сям'і пры незвычайных абставінах. Доўгі час яна была артысткай цырка — да яго закрыцця, а потым па збегу абставін стала насельніцай кантактнага заапарка. Акрамя гэтых гадаванцаў, уім можна сустрэць страуса, янотаў, трусоў і многіх іншых пушысцікаў, якія заўсёды рады новым знаёмствам.

— Ведаеце, я не лічу, што для таго, каб адкрыць кантактны заапарк, патрэбныя нейкія звышмагчымасці. Вядома, прыйдзецца фінансава патраціцца, але, калі сапраўды любіш жывёл, такі занятак будзе толькі ў радасць. Цяпер час інтэрнэту, і калі нешта трэба даведацца ці замовіць корм, гэта не складае вялікіх цяжкасцяў. Але калі сутыкаемся з нейкімі сур'ёзнымі праблемамі, напрыклад, па здароўі, то вязём да сябе ветэрынара. У такіх выпадках не трэба займацца самалячэннем, неабходна звяртацца да спецыяліста. Галоўнае для адкрыцця кантактнага заапарка і наогул усяго, што звязана з жывёламі, — гэта перш за ўсё любоў да іх. Таму што калі проста наняць людзей, якія будуць даглядаць за вас гадаванцаў або сустракаць гасцей, з гэтага практычна нічога не атрымаецца. У нас у раёне мы першыя, хто адкрыў кантактны заапарк, хоць было шмат спроб паўтарыць, праўда, не вельмі ўдалых, таму што не ўкладвалі туды душу. А ў нас усё па-іншаму: выйшаў на двор, а там твае любімыя звяркі. Пацалаваўся з казой, абняў труса, пачухаў за вухам тхара... Для нас гэта кайф, рэальны кайф!

**Ангеліна НОВІКАВА, студэнтка III курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**
**Фота дадзены сям'ёй.**

Бачыць мэту

# ХОЧАШ ЗА РУЛЬ?

## Тады чытай, як з 18 гадоў за яго сесці

**У вольны час многія юнакі і дзяўчаты пачынаюць прыгадваць, як некалі ў дзяцінстве тата дазваляў патрымаць руль і іх радасці не было мяжы. З узростам жаданне апынуцца на запаветным месцы кіроўцы ўзрастае. І вось яны ўжо асвойваюць патрэбныя навыкі і вывучаюць Правілы дарожнага руху, каб у хуткім часе атрымаць правы.**

Многія падлеткі задаюцца пытаннем: «Як я магу навучацца, калі мне ўсяго 15 гадоў?» А вось так. Можаш нават і з 14 гадоў, паколькі, згодна з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб дарожным руху», пачынаць навучанне кіраванню транспартнымі сродкамі можна за два гады да дасягнення мінімальнага ўзросту, неабходнага для атрымання правоў абранай катэгорыі. І тады атрымаецца ўжо на першым-другім курсе ездзіць на ўласным аўто або байку.

• Атрымаць правы АМ і А1 (на кіраванне мапедам і матацыклам з невялікім аб'ёмам рухавіка — да 125 см³) можна ў 16 гадоў, а пачаць навучанне — у 14 гадоў.

• Атрымаць правы катэгорыі А і С (на кіраванне матацыклам з вялікім аб'ёмам рухавіка, самаходнай машынай, колавым трактарам) можна ў 17 гадоў, а пачаць навучанне — у 15 гадоў.

• Атрымаць правы катэгорыі А, В, С (на кіраванне матацыклам, легкавым і грузавым аўтамабілем, а таксама колавым трактарам і самаходнай машынай наступных катэгорый — B, D, E, F) можна ў 18 гадоў, а пачаць навучанне — у 16 гадоў.

• Атрымаць правы катэгорыі D, F, I (аўтобусы, тралейбусы, трамваі), а таксама катэгорыі BE, CE, DE (саставы транспартных сродкаў) можна ў 21 год, а пачаць навучанне — у 19 гадоў.

Што ж значаць гэтыя наборы літар? Такім чынам механічныя транспартныя сродкі, саставы транспартных сродкаў і самаходныя машыны падраздзяляюцца па катэгорыях і падкатэгорыях. Атрымаць правы можна толькі па дасягненні ўстаноўленага ўзросту для сваёй катэгорыі.

Так, дык як жа атрымаць пасведчанне кіроўцы? Першае, што патрабуецца, гэта прайсці медкамісію — яна вызначыць і зафіксуе ў форме медыцынскай даведкі вашу прыгоднасць да кіравання транспартным сродкам. Другое, што неабходна, — навучыцца бяспечна кіраваць ім. Для гэтага вы можаце запісацца ў аўташколу. Навучанне ў ёй ваджэнню звычайна можна праходзіць у любы час па выбары: раніцай, днём, вечарам ці на выхадных. У сярэднім тэрмін навучання на катэгорыю В — каля трох месяцаў. Працэс будзе складацца з дзвюх частак: тэарэтычнай і практычнай. На першай вы вывучыце Правілы дарожнага руху, атрымаеце базавыя веды па ўстройстве аўтамабіля, па аказанні першай медыцынскай дапамогі, навучыцеся вырашаць тэарэтычныя задачы па ваджэнні. Практычная частка заняткаў пройдзе на пляцоўцы (аўтадроме), а таксама ў горадзе. Калі ў вас няма магчымасці наведаць аўташколу, можна самастойна вывучыць тэорыю і практыку. Пасля навучання неабходна здаць унутраныя экзамены па іх і толькі пасля гэтага вы можаце здаваць экзамен у ДАІ. Калі навучаліся ў аўташколе, вам дазволяць праходзіць яго на яе аўтамабілі. А ў выпадку, калі спасцігалі ўсё самастойна, транспартны сродак выдзяляе ДАІ. Важна: кіраванне здаецца на механічнай каробцы перадач! І, вось, вы ўжо трымаеце ў руках сваё запаветнае вадзіцельскае пасведчанне.



Абітурыент Арцём Накаў сёлета навучаўся ў аўташколе і дзеліцца сваімі ўражаннямі:

— Я зразумеў, што хачу атрымаць правы, яшчэ ў раннім узросце. Натхнілі на гэта камп'ютарныя гульні і фільмы. Рыхтаваўся ў нашай аўташколе ў Бялынічах. Абраў яе, таму што не стаў спадзявацца на свае сілы. Лічу, што так усё прасцей і лепш засвойваецца. Там працуюць спецыялісты, якія не першы год у гэтай справе. У групе нас было 30 чалавек: 16 дзяўчат і 14 хлопцаў. Вывучалі тэорыю разам, а на практыцы нас падзялілі на дзве групы. Заняткі па тэорыі праходзілі ў панядзелак, сераду і чацвер у камп'ютарных класах. Яны чымсьці нагадваюць школу: у пачатку — паўтарэнне вывучанага, пасля — новая тэма. Заняткі па ваджэнні прызначаў інструктар — каталіся па нашым горадзе. Навучанне доўжылася чатыры месяцы і каштавала мне 750 рублёў. Аўташкола чаканні апраўдала: вучыцца было прыемна і не сумна. Складанасцяў не ўзнікала, галоўнае — прыкладаць усе намаганні і быць у гэтым зацікаўленым. Зараз мне 17 гадоў. Засталося здаць унутраны экзамен, а пасля 18-годдзя — экзамен у ДАІ. Рады, што зусім хутка атрымаю пасведчанне кіроўцы. Праўда, машыны ў мяне пакуль няма, але ў хуткім часе плануюнабыць. Па меры вопыту буду ўдасканальваць свае навыкі, паколькі хачу навучыцца дрыфту. Усім хачу пажадаць не баяцца — гэта самае галоўнае. Страх — гэта такая штука, якая можа «паставіць крыж» на ўсім навучанні. Тады ўжо і не спраўдзіцца мара.

**Вікторыя ГРЫБКОВА.**


ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в агрогородках Курково, Юрьево, деревнях Шпаковщина, Кальники Усяжского сельского исполнительного комитета Смолевичского района Минской области**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2 | **Дата, время и место проведения аукциона** | 23 сентября 2020, в 11.00, пос. Усяж, ул. Комсомольская, 10 Усяжский сельисполком, кабинет председателя |
| 3 | **Продавец и его адрес** | Усяжский сельский исполнительный комитет, пос. Усяж, ул. Комсомольская, 10 |
| 4 | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | Лот № 1 – земельный участок площадью 0,1200 га в аг. Курково, пер. Луговой (участок № 6, объект № 71/2017) № 624885604101000218.<br>Лот № 2 – земельный участок площадью 0,1000 га в дер. Шпаковщина, ул. Восточная (объект № 74/2019) № 624885607101000250.<br>Лот № 3 – земельный участок площадью 0,1342 га в аг. Юрьево, ул. Озерная (объект № 130/2016) № 624885610501000301.<br>Лот № 4 – земельный участок площадью 0,1500 га в дер. Кальники, ул. Центральная (участок № 3, объект № 98/2018) № 624885603001000110 |
| 5 | **Условия продажи** | а) без изменения целевого назначения земельных участков;<br>б) продажа по цене не ниже начальной;<br>в) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории Республики, или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательством Республики Беларусь;<br>г) при подаче заявления на определенный лот только одним участником, земельный участок продается по начальной цене, увеличенной на 5 %;<br>д) наличие не менее двух участников |
| 6 | **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| 7 | **Начальная (стартовая) цена** | Лот № 1 – 13 000,00 руб.<br>Лот № 2 – 10 000,00 руб.<br>Лот № 3 – 8 000,00 руб.<br>Лот № 4 – 7 000,00 руб. |
| 8 | **Условия аукциона** | - продажа по цене не ниже начальной;<br>- участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики |
| 9 | **Наличие инженерной инфраструктуры** | Возможность подключения к газоснабжению – лот № 1, 2, 3 |
| 10 | **Ограничения в использовании** | Лот № 3 – водоохранная зона реки Усяжа |
| 11 | **Условия оплаты** | Безналичный расчет в течение 10 рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона, без предоставления рассрочки |
| 12 | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10 % от начальной (стартовой) цены земельного участка **р/с BY49AKBB36410000006276200000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК: AKBBBY2X**, назначение платежа 04901 (с пометкой «задаток за земельный участок»), УНП с/и 600023836 |
| 13 | **Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками** | Каждая среда в 10.00 |
| 14 | **Начало приема документов** | 23 августа 2020 года в рабочие дни: понедельник, вторник, среда, четверг, пятница с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| 15 | **Окончательный срок приема документов** | 17 сентября 2020 года в 17.00 |
| 16 | **Контактные телефоны** | 8 (01776) 67-131, 67-288, 8033 902 71 49 |

Расходы по организации и проведению аукциона: лот № 1 – 1 488 руб. 12 коп., лот № 2 – 2 070 руб. 72 коп., лот № 3 – 1 548 руб. 78 коп., лот № 4 – 1 922 руб. 51 коп. и затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

**Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».**

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае если интересы покупателя представляет это лицо).



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО «Слуцкий сыродельный комбинат» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже оборудования:**

**КОМПЛЕКСА БУНКЕРОВ К-850 ДЛЯ ХРАНЕНИЯ ЗЕРНА,**

**состоящий из 22 вертикальных цилиндрических бункеров, установленных на фундаменты, 1976 года выпуска, размер одного бункера: диаметр – 5,7 м, высота – 10,35 м, емкость по пшенице составляет 150 тонн, изготовитель Petkus, Германия, расположенного по адресу: ОАО «Слуцкий сыродельный комбинат», Слуцкий район, д. Знамя, ул. Колхозная, 43.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 266 640,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены (**26 664,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 07.07.2020.

Аукцион состоится **01.09.2020** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **31.08.2020** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17.** УНП 600119098.



УВЕДОМЛЕНИЕ О РЕОРГАНИЗАЦИИ

***В соответствии с требованием п. 1 ст. 56 Гражданского кодекса Республики Беларусь***

**Закрытое акционерное общество «Консул» (ЗАО «Консул») настоящим уведомляет о начале процедуры реорганизации путем присоединения фирмы ООО «Брестагроинторг»** (УНП 290288434) **к ЗАО «Консул»** (протокол внеочередного общего собрания участников ЗАО «Консул» б/н от 17.08.2020 г.)

УНП 200534611.

Андрэй КУЛЕШ

# Я НЕ ЯСЬ, АЛЕ КАСІЎ



**Аўтар гэтай летняй замалёўкі — не толькі касец (як у ёй засведчана), але яшчэ і «швец і жнец»: акрамя таго, што ён стаў лаўрэатам у сёлетнім фінале конкурсу «Слаўная кампанія: рэANIMAцыя» (а летась заваяваў дыплом у яшчэ адным — «Бацькаўшчына светлая мая...»), ужо больш за год «Маладосць» змяшчае на сваіх вокладках яго фотаздымкі і рэгулярна друкуе яго агляды ў рубрыках «Ёсць такая кніга» і «Мой набеліст». Малады слуцкі гісторык Андрэй Кулеш мае рэдкую ў наш час назіральнасць, якая праяўляецца і ў яго тэкстах.**

Раз на год і палка страляе, кажаце? Ну і няхай. Галоўнае, каб не ў лоб. Гэтак жа і рэчы, якія, здавалася б, ужо архаічныя і нямодныя (што людзі скажуць?). Словам, прадметы, якія зусім «усё». Такія ў некаторых краінах на Новы год у акенца — шух са свістам! — і бывай! Але гэта не значыць, што калі я (або нехта) чагосьці не бачу, то гэтага няма або яно знікла.

Нармальная практыка ў людзей ва ўсім свеце, калі рэч адразу не выкідваеш. Яна (рэч) павінна гадоў дваццаць паляжаць, і ўжо потым вырашаецца пытанне: дазволіць ёй і далей пыл нарошчваць ці выкінуць разам з пылам.

Але ёсць яшчэ весялейшы варыянт — выкарыстаць па прызначэнні. Вярнуць былую маладосць нейкай прыладзе і паглядзець ды ацаніць, «як гэта было».

І так аднойчы зранку, калі табе яшчэ рана некуды спяшацца, але за вокнамі ўжо «пеў-пеў-пеў», па газонах насіцца-носіцца — «тра-та-та-та-та» лёскай — маленькі такі бензажах. Спытайце ў котак, якія пры гэтым хаваюцца.

Не тое каб для мяне такі будзільнік быў адкрыццём, але чамусьці тым ранкам зацікавіла месца традыцыйнай касы ў сучаснасці. З чаго пачаць? А ці выкарыстоўваюць іх цяпер?

Заходжу назаўтра ў «Гаспадарчыя тавары». Гляджу — ляжаць косы. Іх яшчэ штампуюць? Ці распрадаюць савецкія рэшткі? Не-а, адносна новыя: у прамасленай паперы з налепленымі штрыхкодамі — бяры і касі. Але не. Паглядзеў, супакоіўся, адвёў душу.

А каб цалкам пазбавіцца мулікаў ад новага бзіку, трэба пашукаць на гарышчы. Звычайна такія рэчы пакідаюць пад кроквамі. Як аказалася, праўда. Здымаеш акуратна. І што з ёй цяпер рабіць? Гугл ігнаруем наўмысна — будзем працаваць з носьбітам ведаў. Вось сусед праз плот. Ён карыстаецца, бо бенз для нарыхтоўкі сена не надта пасуе.

— Мі-іш!

— А-а-а!

— Як касу біць, ведаеш?

— Ну, а навошта табе?

— Трэба.

— Пакажы.

Падношу да плота.

— Ну, бярэш і б'еш, каб роўна і тонка.

— Дзякуй.

Нерваваўся, хібіў, але ўрэшце адолеў. Сабака нічога не разумеў і спрабаваў выхапіць злосную і да гэтага невядомую палку — касаўё.

— Рассохлася дрэва ля самага ляза — пакладзі ў ваду, — падказаў бацька.

— Добра, а брусок дзе?

— Там жа, дзе і заўсёды.

Дзе? Думаю... Ага, пад страхой жа. Так і ёсць. Памятаю, чытаў пра старыя прыстасаванні: калі бруска не было, то палку мазалі гарачай бульбай, зверху сыпалі пясок і тачылі. Або кавалак цэглы бралі з сабой. Але мы не настолькі вычварэнцы ў нашай рэканструкцыі.

Косяць раніцай, калі травы мокрыя. Узяўся — і пайшоў па парадку. «Ш-ш-ш, ш-ш-ш», — канюшынкі пад лязом тваім. Туды-сюды, роўна па крузе, як стрэлка ў амперметры. А гляну на свае ногі — зялёныя, нібы ў жабкі. Як яны ўсё жыццё з такімі нагамі? Яшчэ я заўважыў, што я не адзін, але тыя людзі недзе далёка.

Вясёлы гудок цягніка, які па гуку падобны да грузавога. Здавалася, на месцы стаіш, азірнуўся — амаль футбольная пляцоўка. Выцершы лопухам лязо і рукавом твар, вяртаешся.

Цяпер я разумею, чаму старыя людзі смяюцца з фізічных практыкаванняў, што па тэлевізары ўбачылі, і перадражніваюць: «Фітнес-шмітнес, ха-ха-ха».

Рэзюмэ.

1. Я не Ясь, але канюшыну касіў.
2. На дзяўчыну не паглядаў, бо жыта ніхто не жаў.
3. Мамку жаніць мяне не прасіў — рэальнасць не тая. Ніякіх Станіслаў і Янін.
4. Ручная каса — гэта не артэфакт.
5. Усё суб'ектыўна, таму такая касьба можа быць: а) уласным адкрыццём, б) здзіўленнем, в) незабыўным вопытам і г. д.
6. А для іншых: а) звычайная рэч; б) добрая забаўка, але не на кожны дзень.



**«Маладосць» друкуе падборку новых апавяданняў намесніка галоўнага рэдактара Дзмітрыя Шулюка пад агульнай назвай «Трылогія безгвалтоўнасці». «Часам людзі гатовыя колькі заўгодна хлусіць толькі для таго, каб ім верылі. Часам людзі гатовыя кім заўгодна прыкідвацца толькі для таго, каб іх любілі такімі, як ёсць. Часам людзі гатовыя колькі заўгодна маўчаць толькі для таго, каб іх пачулі». Такімі словамі суправаджае аўтар сваю публікацыю. Чытачам «Чырвонкі». Чырвонай змены» прапануецца паразважаць над імі пры чытанні гэтага ўрыўка.**

Дзмітрый ШУЛЮК

# ЛЯМПАЧКА ПЕРАГАРЭЛА

*Урывак*

Рыжы заўсёды быў прыдуркаваты, але гэтым ён мяне і чапляў. Дзіўна, што толькі мяне. Ці не. Калі шчыра, то астатніх ён таксама чапляў, але інакш. Так чапляў, што ім хацелася яго зачапіць. Так зачапіць, каб запомніў і не чапляў больш. Як? Аднаму чорту вядома. Усе ж ведаюць, што ён заўсёды такі, сам па сабе такі, ды я не пра тое зусім. Ці пра тое. Бо калі казаць пра Рыжага, то ўсё не пра тое і пра тое адначасова.

Рыжы быў добры хлопец. Крэатыўны. Яму такія штукі ў галаву прыляталі, якія нікому не прыляцяць, бо вецер у галаве жыў-гадаваўся, вось і прыносіў усё, што прынясецца, а пасля, як закруціць, як заверціць і такое атрымлівалася... Мне хацелася побач быць у гэткі час, вельмі хацелася. Таму і быў. Як толькі школьны дзень скончыцца, дык я і да яго, ці ён да мяне. Ён пастаянна мне «Ігар-Ігар». Заўсёды па імені і з гэтым паўторам. А яго па імені не называў. Я яго ніяк не называў. «Ты» казаў. Нейкая была мяжа, якую не мог перайсці. Іншымі словамі, я з ім важуся, гуляю, размаўляю, але па імені называць — гэта ж нейк празмерна ўжо. Мы ж проста з ім, не сябры нават. Чапляе. Прыдуркаваты.

Прыбег да мяне а палове на пятую, сем рублёў працягвае і заліваецца.

— Ігар-Ігар, пабеглі. Пабеглі хутчэй. Бяры грошы, бо я згублю. Пабеглі ж. Бяры. Ігар-Ігар.

Я спрабую быць спакойным, бо калі не я, то хто. А ў яго вочы блішчаць, бы там унутры за шкельцамі лямпачка стаіць, настольная, за сталом спакойны хлопчык хатняе заданне выконвае, зараз зробіць, лямпу выключыць і спаць пойдзе, вось тады можна будзе з Рыжым размаўляць.

— Куды?

— У кінатэатр, на «Джокера». Да дзевятнаццаці трэба паспець. Я глядзеў: квіткі яшчэ ёсць.

— У які кінатэатр? Якога «Джокера»?

— Ігар-Ігар, хутчэй. Па дарозе ўсё раскажу. Усе хадзілі, глядзелі. Ігар-Ігар, чаго стаіш. Збірайся, ці ты так пойдзеш?

— Пайду так.

Ну і пайшоў. Іду і думаю, куды іду, чаго, а Рыжы ўсё заліваецца і заліваецца, ляціць і ляціць наперад. Папярэджвае, настойвае, што не паспеем. Ну, кінатэатр «Мір» і праўда не блізка, але да сеанса спакойна павінны паспяваць без лішніх целарухаў, толькі чамусьці пайшлі не на той прыпынак, што бліжэй, а праз пустыр. Ну, няхай. Можа Рыжы ў расклад зазірнуў і зрабіў вывады. Напэўна, зазірнуў. Ён, калі што прыдумвае, то паўсюль зазірае, паглядае, удакладняе — а пасля пачынае рэалізацыю. Нават ведаў, што ў мяне грошы на квіток будуць, не будзе адгаворкі, чаму не пайду. Гэта ж я быў ляпнуў: кніжку хацеў купіць, а не хапіла столькі рублёў, то можа іншым разам. А калі столькі не хапіла, то тут хоць хто падлічыць, колькі было. Атрымалася якраз, каб сёння сунуцца на, здаецца, тут ёсць іронія, «Джокера». Не трэба з мяне смяяцца, зразумела, я чуў пра гэты фільм — проста не хацеў ісці і таму прыдумляў усякае. Не так, каб празмерна ўсякае, але прыдумляў непразмерна. Настрой нейкі быў. У мяне часта такі настрой перад сустрэчамі з Рыжым. Цяжка адразу. Быццам вось ты зараз будзеш на КамАЗе па людзях. Пасля праходзіць. Можа і на КамАЗе так. Не ведаю.

І тут Рыжы, нарэшце, упаў. Гэта я не злараднічаю. Гэта так і ёсць. Нарэшце і нарэшце. Ён ледзь не спінай наперад то бег, то ішоў, то скакаў, вось і паслізнуўся на нейкім смецці. А смецця тут на выбар, можаш слізгаць, можаш каму за каўнер запіхваць, можаш, калі зусім адбіты, цэлыя выхадныя збіраць. Кожныя. Кожныя выхадныя збірацца і нічога тут не зменіцца. Упаў не страшна. Мне не страшна. Яму можа і страшна было. Было б, але ён жа такі ён, што яму такое хоць бы што, тым больш пакуль агонь у вачах. Толькі падумаў — і агонь патух.

— Што? — пытаюся.

Глядзіць на мяне. Вопратку добра забрудзіў, мабыць.

— Бутэрброд, — кажа.

— Бутэрброд, — паўтараю за ім. І яшчэ раз з іншай інтанацыяй. — Бутэрброд?

— Ага.

Ён ківае. Ківае напаўрадасна — усё ж такі я яго з аднаго слова зразумеў. Ківае напаўсумна — усё ж такі бутэрброд. Толькі я нічога не зразумеў з аднаго слова. Аднаго слова мала, каб зразумець, тым больш у такой сітуацыі, тым больш «бутэрброд». Але часам да слова дадаецца дзеянне, і ўсё робіцца куды як празрысцей, быццам табе спрабуюць растлумачыць, што вада гарачая, а пасля льюць яе табе на галаву. Ніякіх слоў не патрэбна. Рыжы ўстае і з задняй кішэні джынсаў пачынае даставаць рэшткі бутэрброда. Не хацеў бы я быць на яго месцы. Яго — бутэрброда. Давайце, толькі без лішніх хахатулькаў. Усе зразумелі, што я не пра кішэню, а пра пашкоджанні, але ўсе жадаюць пабыць гумарыстамі. Паспрабуйце сябе ў стэндапе.

— Навошта ты яго?.. — я недагаварыў, але слоў і так атрымалася ў тры разы больш, чым дагэтуль у Рыжага.

— Я думаў, перад фільмам падзелім.

Вось яно як. Мяне пачаставаць хацеў. Цяпер ён такі не ад таго, што зваліўся ў бруд і яшчэ ежу ў кішэні расціснуў, а ад таго, што не атрымалася мяне пачаставаць. Зрабілася вельмі прыкра. Захацелася паслаць усё куды далей і самому зрабіцца КамАЗам, які не адказвае за дзеянні кіроўцы.

Рыжы, нарэшце, выраўняў сваю маленькую праблему — з вялікімі разбірацца ён не хацеў. Хлопчык у яго вачах прачнуўся і зноў уключыў святло, можа, каб праверыць, ці ўсё прыбраў са стала, можа, каб пакласці тэлефон бліжэй і не бегаць ранкам за будзільнікам па ўсім пакоі. Праверыў ён вельмі хутка, я нават не здзівіўся, ніколі не бачыў, каб гэта святло запальвалі на такі кароткі час. Я нават не здзівіўся, а разгубіўся, калі шчыра — спужаўся.

— Што здарылася? — пытаю.

Рыжы пачаў мацаць усе кішэні. Дзесьці аддалена ў галаве падумалася, што ён, мабыць, яшчэ чаго набраў, але — не.

— Грошы, — выдыхнуў ён. — Няма. Згубіў.

Рыжы апускаецца на калені і мацае ўжо ў траве, рукам дае веры больш чым вачам, бо сонца ўжо не так свеціць і грэе, як магло б. Мне падаецца, што ён не толькі мацае. Мне падаецца, што ён ногцямі ўгрызаецца ў зямлю, што зараз ён угрызецца зубамі, быццам грошы валодаюць здольнасцю як чэрві ўцякаць углыбіню ад такіх прыдуркаватых рыжых. Я гляджу. Цямнее. Нейк алегарычна ці метафарычна — я не дакладна ў гэтым разбіраюся — з цемрай расце і мая злосць на гэтага чалавека. Выцягнуў. Пацягнуў. Ды пайшоў ён к чорту. Не кажу ні слова і іду адзін далей. Куды? На «Джокера». Выйшаў. Пайшоў. Супыніцца? Мы разам збіраліся? Я нікуды не збіраўся. Ён збіраўся. А цяпер пайду я. Такое жыццё.

Рыжы не пабег за мной. Рыжы нават не паглядзеў на мяне. Я спінай адчуваў, што адчувае ён. Бо ён заўсёды быў такі. Прыдуркаваты. Ён так вінаваціў сябе. Ён так вінаваціў сябе, што рабілася яшчэ цямней, і майго цела ўжо не хапала, каб утрымаць увесь гнеў, усю злосць, усю нянавісць. Хацелася бегчы без ніякіх аўтобусаў і тралейбусаў гэтыя некалькі кіламетраў да метро, бегчы не супыняючыся, каб разам з энергіяй выйшла ўсё непатрэбнае. Чаму яно мяне захапіла? Хацелася бегчы, але я сціскаў кулакі і зубы. Я казаў сабе, што ўсё раблю правільна. Я паўтараў сабе гэта, пакуль не ўспомніў, што Рыжы аддаў свае грошы мне, каб не згубіць. І тады я пабег.

SEX-БАЛЯСЫ

# А ПА БАРАБАНЕ!

**У вашым атачэнні ёсць людзі, для якіх чужое меркаванне — пусты гук? («Вось сядзіць у чалавеку дурнота, а ён з гонарам называе гэта характарам».) Каму на яго начхаць? («І стварыў мяне Божа. З цынізмам, канешне, перабраў, са спачуваннем дакладна недапрацаваў, пачуццё гумару з лішкам, жаданне кантактаваць з людзьмі няма ўвогуле, карацей, нейкая брыдота атрымалася».) Упэўнены на сто працэнтаў, што так, давадзілася з такімі сустракацца. («Для многіх гэта прагучыць дзіка, але я не карыстаюся прэзерватывамі. Мне здаецца, што гэта глупства — карыстацца імі, калі ў цябе няма сексу».) Нават калі не рызыкняце прыгадаць кагосьці з блізкіх, вы ўсё роўна сустракаецеся з падобнымі грамадзянамі штодня, прычым, неаднойчы. Не верыце? («Дурняў у свеце мала. Але расстаўлены яны так дакладна, што сустракаюцца на кожным кроку».)**



Ну, вось сумленныя аўтамабілісты вельмі не любяць тых, хто спрабуе абагнаць іх па ўзбочыне. («Хлопцы, якія паварочваюць направа з левага крайняга рада, памятайце — дома вас чакаюць вашы хлопцы».) Вы зразумелі, пра што гаворка? («Нацыянальная шахматная федэрацыя ЗША прыняла новыя правілы для сваіх шахматыстаў. Згодна з імі, з васьмі белых пешак цяпер дзве будуць чорныя, а адна — блакітная».) Ці вось яшчэ сітуацыя. Вы нідк на пустой дарозе не можаце размінуцца з адзіным мінаком. Памятаю, ішоў да метро. Метраў за 30 наперадзе крочыла бабуля. Я спрабаваў вылічыць, у якую з чатырох дзвярэй на ўваходзе яна хоча патрапіць. Ха-ха! Яе паходка нагадвала супрацькарабельны зігзаг, якія надводныя судны выкарыстоўваюць, каб мінімізаваць рызыку атакі з боку падлодак. Мы ўсё роўна сутыкнуліся (пры адсутнасці іншых пасажыраў!) у адных дзвярах! («У метро мяне выбешваюць дзве катэгорыі людзей: тыя, якія спыняюцца перад указальнікамі і даводзіцца іх адштурхоўваць, каб прайсці, і тыя, хто штурхаюцца, калі ты стаіш і спакойна чытаеш указальнік».) Ды што метро? («Вось мы стаім каля перахода, паралельна, бок у бок, плячом да пляча, і глядзім у адным напрамку — наперад. Загараецца святлафор, і ты чамусьці ідзеш па дыяганалі і аказваешся перада мной. Ты што, ферзь?»)

А размовы па мабільніках на людзях? («Тыя, хто лаецца па тэлефоне ў грамадскіх месцах, стаўце апарат на гучную сувязь: хочацца ведаць меркаванне двух бакоў, калі ўжо даводзіцца слухаць».) Дарэчы, гэта асобная тэма — людзі з гаджэтамі. Натуральна, зомбі. («Сучасная размова па мабільным — па-купецку. Гэта калі трымаеш гаджэт перад вуснамі так, як раней пілі чай са сподачка».) Ну адыдзі ў бок, калі гаварыць трэба, пастой там, не замінай іншым. Ты ж не 300 спартанцаў, каб стрымліваць націск ворагаў — перашкаджаць астатнім. Гэта ж мала таго, што нязручна для іншых, дык яшчэ і стварае пагрозу для здароўя і жыцця саміх карыстальнікаў. Дарэчы, з год таму чытаў навіну, што нейкая кампанія збіралася распрацаваць мабільную праграму, якая будзе аўтаматычна адключаць мабільны тэлефон, калі чалавек карыстаецца пешаходным пераходам. («Сёння бачыў, як бабуля дапамагла перайсці дарогу хлопчыку, які «тырчаў» у айфоне».)

А жанчыны? («Быць дзяўчынай — гэта калі ты вядзеш вайну, выйграеш, прайграеш, а апанент нават і не ведае, што вы ваюеце».) Яны часам бываюць такія ж. («— Я выдаткоўваю грошы на патрэбы сям'і. — Але тут жа танальнік, патчы для вачэй і бутэлька віна... — Сям'я мае патрэбу ў прыгожай і шчаслівай жанчыне».) Ну, каму не пашчасціла... («Галоўнае ў жыцці — знайсці чалавека, якога будзеш выбешваць усё астатняе жыццё».)

Бывае, здзіўляюць малыя. («Дзіця спытала, што такое аборт. Я сумелася, але сабрала ўсю волю ў кулак і, як магла, у агульных рысах растлумачыла. І толькі напрыканцы спытала, дзе яно пачула такое слова. — У песні. — У якой такой песні? — «І б'ецца хваля аб борт карабля»...») Але ім гэтую непасрэднасць можна дараваць, праўда? («Дзіцё тут задало пытанне: «Што такое аргазм»? І самае горшае не пытанне, а тое, што ўся маршрутка чакала майго адказу».)

...І напрыканцы пра тыя самыя барабаны. («На вяселлі сяброў Таццяна пабегла лавіць букет нявесты, потым ачомалася і вярнулася назад. Бачылі б вы вочы яе мужа».) Японская 32-гадовая мадэль Юкі Асакі грае на ўдарных у споднім, захапляючы тым аматараў музыкі. («У кожнай жанчыны ў гардэробе павінна быць маленькая чорная маска».) Дзяўчына навучылася граць на барабанах яшчэ ў старэйшых класах. Зараз найчасцей у яе рэпертуары прысутнічае музыка з анімэ, але часам Юкі прапануе слухачам знакамітыя хіты. Яна ўдзельнічае ў групе Little Lilith і вядзе свой ютуб-канал. Выконваючы кампазіцыі, японка дэманструе прыгожае цела і выдатную тэхніку. («— Вы сядзіце на маім капелюшы. — Я ведаю. А вы што, ужо сыходзіце?») Як пішуць, гледзячы на шчаслівы твар Юкі, можна зразумець, што дзяўчына атрымлівае масу задавальнення ад таго, чым яна займаецца. («Маша вяла актыўнае распуснае жыццё, ні ў чым сабе не адмаўляючы, жыла з дэвізам «Каб было што ў старасці ўспомніць!» Дарэмна старалася... У старасці Марванну накрыў склероз...») Відэазапісы мадэлі набіраюць сотні тысяч праглядаў і ўхвальных каментарыяў. А таму, што — па барабане! («Апошнімі перастануць насіць маскі страшэнькія дзяўчаты».)

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Няма забароненых тэм, ёсць дрэнныя жарты»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Малады чалавек лічыць, што перамены ў стаўленні гледачоў да комікаў звязаны з актыўным развіццём мастацтва стэндап-камедыі:

— У нас такі працэс адбываецца вельмі хутка таму, што гэта новы і цікавы для краін СНД жанр. Калі ў Амерыцы і Вялікабрытаніі ён існуе ўжо каля сямідзесяці гадоў, дык у нас першыя стэндапы пачалі паказваць па тэлебачанні толькі ў 2013 годзе.

Вельмі часта можна пачуць, што амерыканскі гумар — рэч вельмі спецыфічная. Але ў чым менавіта адрозненне славянскага гумару ад заходняга? Фёдар дае каментарый з прафесійнага пункту гледжання:

— Мне здаецца, што «наш» гумар больш моцны, бо ён будуецца на прамым жарце, канкрэтным смешным сказе. Без аніякіх хадоў, якія часта выкарыстоўваюць на Захадзе, накшталт каламбураў, зломаў (комік кажа пра адно, але ўсе разумеюць, што гаворка ідзе пра іншае). У нас — чыстая рэпрыза (кароткі тэкставы жарт), а ў іх — сарказм, іронія. З-за гэтага, на маю думку, рускамоўны гумар і з'яўляецца больш моцным.

Аднак, каб дабіцца поспеху, абавязкова трэба цікавіцца ўсімі сусветнымі практыкамі. Фёдар, у першую чаргу, глядзеў заходні стэндап, чытаў адпаведную літаратуру, але ніколі не арыентаваўся на кагосьці канкрэтнага, шукаў сябе. У яго няма куміраў, але ёсць комікі, творчасць якіх малады чалавек вельмі паважае і раіць чытачам «Чырвонкі. Чырвонай змены» таксама з ёй пазнаёміцца. Па-за канкурэнцыяй Эдзі Мёрфі і Джордж Карлін. Далей — Біл Бёр, Джым Джэфірс і Джо Роган.

Фёдар уваходзіць у арганізацыю «Stand-Up Minsk», з якой ён і калегі выступаюць на розных пляцоўках нашай сталіцы. Таксама існуе праграма «Stand-Up Region», у рамках якой комікі выступаюць у Смалявічах, Жодзіне, Барысаве і іншых рэгіянальных гарадах. Рэгулярна артысты з «Stand-Up Minsk» падарожнічаюць у Маскву і выступаюць у «StandUp Store Moscow» — найлепшым стэндап-клубе на тэрыторыі краін СНД. Акрамя таго, Фёдар выступаў у Латвіі і Літве. А на пытанне, ці змяняецца праграма стэндапу ў залежнасці ад таго, у якой краіне або горадзе плануецца канцэрт, Фёдар адказвае:

— Змест выступлення ад гэтага не залежыць, трэба проста прыбраць лакальныя жарты, якія канкрэтная аўдыторыя не ацэніць. Зразумела, што ў рэгіёнах не варта гаварыць з гумарам пра метро. Замест гэтага стараюся дадаць актуальныя для гэтай мясцовасці жарты. Прыехаць у Латвію і не пажартаваць пра шпроты нельга ж! Лакальнага гумару не так шмат. Але ёсць рэчы, якія ўсюды аднолькавыя: сяброўства, каханне, сямейныя стасункі... Жартуем у асноўным аб гэтым. Але самыя гарачыя жарты атрымліваюцца менавіта на актуальныя тэмы!

Так, аднойчы даваў канцэрт у літоўскім горадзе Вісагінас. Там да некаторага часу знаходзілася атамная электрастанцыя, але пры ўваходжанні краіны ў Еўрасаюз яе работу спынілі. З-за гэтага шмат людзей пазбавіліся рабочых месцаў, і населены пункт стаў нязручным для жыцця. Зараз там адпакаёвую кватэру можна набыць усяго за пяць тысяч долараў! Мяне гэта вельмі ўразіла, і я пажартаваў: «Хэй, дзяўчына, у мяне ёсць пяць тысяч «зялёных», выбірай любое жыллё, якое табе падабаецца, усё куплю!»




**Фёдар з камандай «Stand-Up Minsk».**

Стэндаперы ў сваіх выступленнях маюць магчымасці падымаць злабадзённыя тэмы, з гумарам асвятляць сучасныя тэндэнцыі накшталт фемінізму або ЛГБТ-тэму. Але ці ёсць табу, нейкія тэмы, на якія жартаваць забаронена? Фёдар лічыць, што такіх няма. Адзінае, пра што не стаў бы жартаваць малады чалавек, — гэта пра нешта агіднае.

— Няма забароненых тэм, ёсць дрэнныя жарты. А каб жарт не быў дрэнным, ён не павінен нікога абражаць.

Пасля выхаду фільма «Джокер», а таксама шматлікіх інтэрв'ю з вядомымі рускамоўнымі стэндаперамі, у гледачоў склалася ўражанне, што комікі ў жыцці вельмі сур'ёзныя, глыбока думаючыя, часам дэпрэсіўныя... Фёдар пацвярджае, што часцей за ўсе так яно і ёсць, але менавіта пра сябе кажа, што ён не дэпрэсіўны чалавек.

— Канешне, стэндап — гэта боль. Ты жартуеш аб тым, што ў цябе баліць, каб пазмагацца з гэтай праблемай. Ты бярэш свой боль, працуеш над ім, а потым падзяляеш яго з гледачамі. І артысту, і аўдыторыі становіцца лягчэй. Мы з калегамі часта жартуем, што гэта асабліва псіхатэрапія.

Комік нават прызнаўся, што бывае сапраўды злы на сцэне, асабліва калі выступае з новым матэрыялам упершыню.

Фёдар адкрыты да ўсіх прапаноў, бо для поспеху артысту абавязкова патрэбны эфіры:

— Пакуль іх няма на тэлебачанні і ў інтэрнэце, гледачы не будуць набываць квіткі на твае канцэрты. На жаль, аўдыторыі абавязкова трэба, каб нехта з экрана сказаў: «Так, ён сапраўды смешны!» І толькі тады на цябе звернуць увагу. А складзі асабістае меркаванне многія чамусьці ляняцца... Накошт цікавых праектаў: крута было б выступіць у «Вячэрнім Урганце» або напісаць маналог для стэндапа на ТНТ... Таксама я з задавальненнем паспрабаваў бы сябе на «Пражарцы», унікальным расійскім камедыйным шоу, у якім дазваляецца высмейваць, часам у вельмі грубай форме, вядомых асоб, якія дзеля гэтага на яго і прыходзяць.

Цяпер Фёдар займаецца развіццём свайго асабістага праекта пад назвай «Stand-Up Ronin». У яго ёсць свой ютуб-канал, куды суразмоўнік выкладвае запісы сваіх канцэртаў, набірае прагляды ў інтэрнэце і пашырае аўдыторыю.

На думку коміка, стэндап зручны тым, што артыст выступае адзін. Сам піша жарты, сам рэдагуе іх, арыентуючыся на водгукі залы... Усё гэта вельмі адрозніваецца ад КВЗ, дзе абавязкова патрэбна каманда. Бывала, што ў адзіночку рассмяшыць залу не атрымлівалася нават у бывалых вясёлых і знаходлівых.

— Справа ў тым, што калі ты выступаеш з камандай, напрыклад, у восем чалавек, няўдачу вы дзеліце на ўсіх. А калі ты адзін усю гэтую цішыню «паеў», дык адзін за ўсё і адказваеш.

Нягледзячы на тое, што стэндап — гэта яшчэ не вельмі звыклы спосаб правядзення вольнага часу для беларускага слухача, ён сапраўды заслугоўвае ўвагі, бо вельмі шчыра і празрыста адлюстроўвае ўсё сферы жыцця, якія турбуюць кожнага чалавека. Падчас канцэрту вы абавязкова пасмеяцеся над чымсьці, што вас закранае, і вам сапраўды стане лягчэй. Таму ніколі не трэба чакаць, пакуль з тэлевізара хтосьці скажа запаветную фразу пра смешнага коміка. Трэба самому скласці сваё асабістае меркаванне пра творчасць гэтых цікавых выступоўцаў — стэндап-комікаў!

**Паліна ПРАКАПЕНЯ,**
**студэнтка II курса факультэта журналістыкі БДУ.**
**Фота з архіва суразмоўніка.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 19.08.2020 г.

# «Прадам IPHONE11 у выдатным стане»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прадавец запісвае мне гукавое пасланне: «І глядзіце, забыла вам сказаць. Я прапаную так правесці здзелку. Я працую на складзе ў кампаніі СДЭК (сапраўды такая кампанія існуе, займаецца экспрэс-дастаўкай грузаў. — «**Зв.**»). Прапаную вам зрабіць аплату праз іх сайт, праз разліковы рахунак. Калі мне прыйдзе трэк-код, вы ўносіце грошы проста на іх сайт, і яны ляжаць да атрымання і праверкі вамі тэлефона. Гэта зроблена для таго каб... ну, раптам у вас там нейкі мужчына па галаве кур'еру дасць і ўцячэ з тэлефонам. Такія выпадкі бывалі. Каб гэтага не адбылося, прапаную зрабіць такім чынам». На месцы *«раптам у вас там нейкі мужчына па галаве кур'еру дасць»* дачцэ стала смешна, а я зразумела, што маю справу з дзіўнаватым чалавекам.

**Першае, дарэчы, што ўбачыла на афіцыйным сайце СДЭК, — аб'яву «Увага, махляры!» А ў ёй — якраз амаль мой выпадак.**

На ўсякі выпадак пытаюся: а як забраць свае грошы, калі раптам кур'ер не даедзе? Прыходзіць чарговае гукавое паведамленне: "Глядзіце, я растлумачу, як працуе гэта сістэма. Я ў гэтай кампаніі працую ўжо цягам трох гадоў і пастаянна адпраўляю пасылкі ў іншыя краіны, калі людзі просяць ці яшчэ штосьці. У гэтым выпадку выкарыстоўваецца часцей за ўсё накладная плата. Кур'ер у любым выпадку даедзе. Вы далі мне свае звесткі, я аформіла заяўку на сайце ў электронным фармаце. Калі пасылку адсартуюць на складзе і яна будзе ў машыне ў кур'ера, мне прыйдзе на пошту электронны трэк-нумар. Я дасылаю яго вам. Вы звяраеце ўсе даныя. Калі ўсё правільна, кладзяце грошы ў рэзерв на іх сайт. Грошы ляжаць да атрымання і праверкі там. Калі кур'ер перадае вам тэлефон, з'яўляюцца дзве кнопкі: адна — так, мяне ўсё задаволіла, а другая — не, вярнуць тавар прадаўцу і вярнуць грошы. Калі кур'ер прыязджае, вы маеце 15 хвілін на праверку, усё аглядаеце, калі вас усё задавальняе, вы націскаеце адну кнопку. Калі нешта не спадабалася, мы дамаўляемся на знішэнне цаны або націскаеце кнопку «не» і вам вяртаюць грошы».

Сістэма адразу здаецца мне сумнеўнай, і я кажу, што не ўпэўнена, што на картцы ў мяне дастаткова грошай. Прадавец адказвае, што гатова скінуць цану да 1400 рублёў — адразу 100 рублёў! Здавалася б, я канчаткова павінна заглынуць нажыўку, але ў мяне, наадварот, усе сумненні знікаюць. Пішу, што сістэма для мяне занадта складаная і рызыкаваць не хачу. Мяне пераконваюць, што нічога складанага няма, праз пяць хвілін павінен прыйсці трэк-код. «Усё, што ад вас патрабуецца, — унесці грошы і пацвердзіць здзелку, калі прыедзе кур'ер».

Сапраўды праз колькі хвілін яна дасылае інтэрнэт-спасылку на старонку, мяркую, што фішынгавую (такія старонкі капіруюць інтэрфейс і маскіруюцца пад сайт рэальнай кампаніі, іх выкарыстоўваюць інтэрнэт-аферысты для атрымання звестак, напрыклад, такіх як лагін, пароль і даныя банкаўскіх картак). Яна з лагатыпам СДЭК, і нібыта мне адпраўлена пасылка: указаны мае прозвішча, адрас і тэлефон, нумар заказу. Мне трэба ўвесці даныя карты і аплаціць. Зразумела, я не збіраюся. Але дзіўчына працягвае ціснуць мне на сумленне: «Апошнія лічбы тэлефоннага нумара правільныя?», «Калі штосьці не разумееце, напішыце ім у падтрымку праз трэк-нумар, вам растлумачаць», «Чакаю адказу ад вас», «Тэлефон ужо едзе да вас», «Ужо хвілін 10–15», «Дык вы мне адкажаце?» — дзясятак паведамленняў цягам лічаных хвілін.

Ну а што адказаць? Здаецца, я ўжо дала зразумець, што аплачваць не буду. Я заходжу на сапраўдны сайт кампаніі СДЭК, уводжу нумар заказу, які мне даслалі. Заказ не знойдзены, прадказальна піша мне сайт. Скрын гэтай старонкі адпраўляю маёй настойлівай суразмоўніцы. Яна тлумачыць, што ён яшчэ не актыўны, бо я не пералічыла грошы. Упэўнена, што ён ніколі і не будзе актыўны, нават калі б і пералічыла.




Мае махляры — людзі інтэлігентныя, за грубасць выбачаюцца.

Першае, дарэчы, што ўбачыла на афіцыйным сайце СДЭК, — аб'яву «Увага, махляры!» А ў ёй — якраз амаль мой выпадак. «Паважаныя кліенты, будзьце ўважлівыя і асцярожныя. Махляры, выкарыстоўваючы кампанію СДЭК, уцягваюць у давер да пакупнікоў тавараў. Пад выглядам прадаўцоў тэлефонаў, мэблі і іншага на розных гандлёвых пляцоўках знаходзяць пакупнікоў. У пацверджанне нібыта ажыццёўленай адпраўкі тавару махляры дасылаюць фота накладной кампаніі СДЭК, на якой прысутнічае толькі штрых-код, але няма нумара накладной. Такія накладныя — гэта падробка. На арыгінальнай накладной кампаніі СДЭК заўсёды ёсць нумар адпраўкі для адсочвання накладной на сайце. Будзьце пільныя!» Адпраўляю спасылку на гэтае паведамленне: калі не адчэпіцца, то хоць цікава, чым растлумачаць.

«І што там напісана? Вы самі прачыталі? Там напісана пра накладную без нумара. У мяне пакуль ніякай накладной нават няма!» — паведамленнямі крычыць на мяне прадавец. Мяне зноў просяць перайсці па спасылку, аплаціць і даслаць фота. Бо тэлефон, на хвіліначку, да мяне ўжо едзе. Разумею, што проста так ад мяне не адчэпяцца, таму ўжо проста да канца працягваю выконваць навязаную мне ролю не зусім разумнай жанчыны і задаю свае наіўныя пытанні. Чаму нельга заплаціць кур'еру наяўнымі грашыма? На сайце, між іншым, напісана, што такая магчымасць ёсць. Адказваюць, што заказ зроблены з дапамогай інтэрнэту, таму і такі від аплаты. «І кур'ер можа грошы прывезці праз два-тры дні. А мне заўтра крэдыт заплаціць трэба апошні за кватэру. Інатэку закрыць». Цікаўлюся: няўжо ў Беларусі ёсць іпатэка? «У Беларусі няма, у Расіі ёсць» (насамрэч у Беларусі таксама ёсць, але памятаем, што я не надта дасведчаная жанчына). «А, дык вы з Расіі працуеце?» — пытаюся. — «Не, я не працую з Расіі. У мяне малады чалавек з Расіі. Купіў кватэру ў іпатэку, застаўся апошні плацеж. Я родам з Беларусі, але буду адсюль пераязджаць, пераядуся з гэтага філіяла СДЭК у Расію».

Ад гэтай жаласлівай гісторыі пра хлопца і іпатэку, праз якіх прыходзіцца прадаваць апошні iPhone, мой недавер павінен канчаткова расці. Але я працягваю і ўжо не хаваю, што падазраю махлярства. Кажу, што дасланая мне старонка СДЭК для аплаты фішынгавая, і пытаю, ці магу я сходзіць у офіс СДЭК і ўдакладніць гэта. Мне адказваюць, што ўжо позна і ўсе офісы кампаніі зачыненыя. Далей у мяне яшчэ дзясяткі пытанняў, на якія мне цярпліва адказваюць: яшчэ і яшчэ тлумачаць пра трэк-нумар, які абавязкова актывізуецца, і з змагу адсачыць сваю пасылку, і пра службу падтрымкі, у якую з гэтай старонкі можна напісаць і дзе чакаюць маіх пытанняў, і пра тое, што кур'ер абавязкова даедзе, нягледзячы на тое што абяцаныя 2,5 гадзіны даўно прайшлі. Нават пасля маіх слоў, што ўсё гэта махлярства, мяне пераконваюць, што не. Шматгадзінная перапіска абрываецца а восьмай гадзіне вечара, толькі пасля майго апошняга нахабнага паведамлення пра тое, што я пракансультавалася ў міліцыі, і мне параілі нічога не аплачваць, бо нават калі аплачу, тэлефон наўрад ці атрымаю.

Як расказваюць прадстаўнікі «Куфара», у асноўным махляры выкарыстоўваюць стандартныя схемы, апрабаваныя ў Расіі. Нярэдка яны самі знаходзяцца ў Расіі і працуюць адтуль. Падмануць могуць як тых, хто прадае тавар, так і тых, хто набывае. Выкарыстоўваюць даверлівасць і адкрытасць беларусаў: могуць расказаць, што трапілі ў складаную жыццёвую сітуацыю і прадаюць рэч, бо трэба аплаціць лячэнне блізкаму, выратаваць бізнес ці аплаціць крэдыт.

Адна з такіх схем — для тых, хто набывае тавар, калі махляр кажа, што гатовы адправіць тавар поштай. Ён накіроўвае ахвяры ссылку на падробленую старонку трэкінгу пасылкі ці скан падробленага дакумента аб аплаце. Калі ахвяра запэўніваецца, што тавар адпраўлены, махляр высылае спасылку на фішынгавы сайт для правядзення аплаты.

Падобная схема — калі злаўмыснік таксама адмаўляецца ад асабістай сустрэчы (кажа, што жыве ў іншым горадзе) і прапануе скарыстацца паслугай халдыравання сродкаў (рэзерваванне іх на пэўны тэрмін). Перадаплата замарожваецца на картцы пакупніка, і сродкі спісваюцца толькі пасля таго, як ён атрымае тавар. Зразумела, што спасылка, на якую прапануе прайсці прадавец-махляр, каб увесці даныя карткі, вядзе на фішынгавы сайт і звесткі будуць скрадзены.

**Алена КРАВЕЦ.**

Спорт

# Трэба яшчэ пачакаць

## Адменены шэраг міжнародных спаборніцтваў

**Спартыўнае жыццё паступова вяртаецца да свайго звыклага рытму пасля пандэміі каранавіруса. Але не ўсе спартыўныя федэрацыі на сёння гатовыя праводзіць вялікія міжнародныя спаборніцтвы. У жніўні многія спартыўныя аб'яднанні абвясцілі аб пераносе ці адмене турніраў. Прычына ва ўсіх адна — цяжкая эпідэміялагічная сітуацыя і нежаданне рызыкаваць здароўем удзельнікаў. Гэтыя рашэнні закранулі і беларускіх спартсменаў.**

Еўрапейская федэрацыя хакея на траве вырашыла не праводзіць фінал васьмі Еўрапейскай хакейнай лігі, які быў запланаваны на 14–18 кастрычніка ў Амстэрдаме. Удзел у турніры збіралася ўзяць жаночая каманда хакейнага клуба «Мінск». Наступны розыгрыш фіналу васьмі Еўрапейскай хакейнай лігі сярод жаночых камандаў пройдзе 15 красавіка 2021 года. Сярод удзельнікаў — па адной камандзе Беларусі, Іспаніі, Англіі, Ірландыі і па дзве дружыны Нідэрландаў і Германіі.

З 15 да 18 кастрычніка ў Румыніі павінен быў прайсці чэмпіянат Еўропы па веславанні на байдарках і каноэ. Еўрапейская асацыяцыя каноэ яго адмяніла. «З улікам эпідэміялагічнай сітуацыі ў Еўропе, дзе ў некаторых краінах існуюць абмежаванні на наведванне іншых дзяржаў, а таксама прымаючы да ўвагі рэкамендацыі кіраўніка медыцынскай камісіі ЕАК Джэйн Гібсан, за 60 дзён да пачатку спаборніцтваў было прынятае рашэнне аб адмене чэмпіянату Еўропы ў Басхаве», — гаворыцца ў афіцыйнай заяве Асацыяцыі.

Перанесены чэмпіянат Еўропы па настольным тэнісе, які аматары і ўдзельнікі рыхтаваліся ўбачыць з 15 да 20 верасня ў Варшаве. «Бяспека гульцоў, трэнераў і арганізатараў мае галоўнае значэнне. Паколькі не ўсе нацыянальныя федэрацыі могуць узяць удзел у спаборніцтвах, гэты турнір нельга будзе называць сумленным», — паведаміла кіраўніцтва Еўрапейскага саюза настольнага тэніса. Новыя даты правядзення чэмпіянату будуць аб'яўлены пазней. Перанесены і кангрэс Еўрапейскага саюза настольнага тэніса, які павінен быў прайсці падчас кантынентальнага першынства.

Выканаўчы камітэт Міжнароднага саюза трыятлона адмяніў два этапы Кубка свету. Этап у венгерскім Цісаўйвароўшы ўжо быў перанесены з ліпеня на восень. А спаборніцтвы ў Тхан'ене (Рэспубліка Карэя) былі запланаваныя на 17-18 кастрычніка.

У 2020 годзе не адбудзецца славуты парыжскі марафон, які праводзіцца з 1976 года па знакавых месцах французскай сталіцы. Забег павінен быў прайсці 5 красавіка, потым быў перанесены на 18 кастрычніка, а затым — на 15 лістапада. У рэшце рэшт арганізатары вырашылі ўвогуле не праводзіць спаборніцтвы: «Прымаючы гэта рашэнне, мы ўлічвалі цяжкасці, з якімі сутыкаюцца спартсмены, асабліва замежныя, пры падрыхтоўцы да спаборніцтваў, намечаных на 14-15 лістапада. Мы прынялі рашэнне, што для іх будзе прасцей, калі мы правядзём марафон у 2021 годзе».

Але ёсць і добрыя навіны. Мінскі паўмарафон, які плануе сабраць 42 000 удзельнікаў, пройдзе ў беларускай сталіцы 13 верасня. Рэгістрацыя на бегавое свята працягваецца.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Крупский плодоовощной завод»

| № лота | Наименование лота | Месторасположение | Начальная стоимость с НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Трансформаторная подстанция КТП-160 | Минская область, г. Крупки, ул. Московская, д. 1 | 288,00 | 28,80 | 14,40 |

*В отношении вышеперечисленного имущества проводятся первые торги.* **Начало приема заявлений в 10.00 24.08.2020. Окончание приема заявлений в 16.00 24.09.2020**

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | ООО «Фрондера», тел. +375 29 308 28 97; e-mail: info.torgi@orgtorg.by |
| **Информация о продавце** | ОАО «Крупский плодоовощной завод», Минская область, г. Крупки, ул. Московская, д. 1 (ликвидатор – ООО «Партнер-Консультант», тел. +375 29 304-59-90) |
| **Дата и время проведения торгов** | **25 сентября 2020 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1121 |

Заявление на участие в торгах и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1121 либо по электронной почте: info.torgi@orgtorg.by

**Условия для участия в торгах**

1. До подачи заявления внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: «Задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Крупский плодоовощной завод» (Лот №__), проводимом 25.09.2020 г.».

2. Подать заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка. К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16. Образец заявления и перечень документов можно посмотреть на сайте **https://orgtorg.by/info.** Лица, желающие принять участие в аукционе, и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях в течение 14 (четырнадцати) дней с момента подписания протокола о результатах аукциона и возмещения победителем затрат по организации и проведению торгов в размере 5 % от начальной стоимости объекта торгов, а также затрат по размещению публикации (согласно выставленному счету). Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.

**3. Вознаграждение аукциониста – 5 % от конечной цены предмета торгов.**

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. Контактное лицо для осмотра объекта торгов: тел. +375 29 304-59-90.

## ООО «Фрондера» извещает о проведении торгов в форме конкурса по продаже имущества ОАО «Забашевичи»

| | |
|---|---|
| Организатор торгов | **ООО «Фрондера»,** 220113, Республика Беларусь, г. Минск, улица Мележа, д. 1, офис 1121, тел.: 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by |
| Продавец | **ОАО «Забашевичи»** (222117, Минская обл., Борисовский р-н, Гливинский с/с, аг. Забашевичи, тел. +375 17 772 71 12) в лице управляющего – ООО «ПрофДМ» (220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1118-27, тел. +375 17 395 89 17) |
| Форма, дата, место и время проведения торгов | Пятые повторные торги в форме конкурса проводятся **16.09.2020 в 12.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121** |
| Сведения о предмете торгов и порядок ознакомления с ним | **Лот № 1: предприятие как единый имущественный комплекс «Забашевичи».** **Место нахождения Лота:** Республика Беларусь, Минская обл., Борисовский район, аг. Забашевичи. По вопросу ознакомления с предметом торгов обращаться по тел.: +375 29 862-80-48 (Лекарев Василий Иванович). Дополнительная информация по предмету торгов, в том числе о составе предприятия как имущественного комплекса, по телефону +375 44 549 24 17 (Леонид) |
| Начальная цена предмета торгов (без учета НДС) | **Лот № 1: 506 400,00 BYN** (пятьсот шесть тысяч четыреста белорусских рублей 00 копеек) без НДС, согласно подп. 2.30.1 ст.115 Налогового кодекса Республики Беларусь (Особенная часть) от 29.12.2009 № 71-З |
